КАМУНІЗМ СТАНОВІЦЦА ЯВАЮ НАШЫХ ДЗЁН

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 84 (1618) | Аўторак, 24 кастрычніка 1961 года | Цана 4 кап.

На XXII з'ездзе КПСС

19 кастрычніка ў Маскве, у Крамлёўскім Палацы з'ездаў, працягваў сваю работу чарговы XXII з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

З'езд абмяркоўваў справаздачу Цэнтральнага Камітэта КПСС, праект Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і справаздачны даклад Цэнтральнай Рэвізійнай Камісіі КПСС.

На ранішнім пасяджэнні з'езда выступілі таварышы: П. Н. Дзёмічаў — першы сакратар Маскоўскага гарадскога камітэта КПСС, М. В. Падгорны — першы сакратар ЦК Кампартыі Украіны, І. В. Спірыдонаў — першы сакратар Ленінградскага абкома КПСС, К. Т. Мазураў—першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі, Ш. Р. Рашыдаў — першы сакратар ЦК Кампартыі Узбекістана, Д. А. Кунаеў—першы сакратар ЦК Кампартыі Казахстана.

На вячэрнім пасяджэнні з'езд віталі горача сустрэтыя дэлегатамі і гасцямі прадстаўнікі зарубежных камуністычных і рабочых партый: таварышы Чжоу Энь-лай—намеснік Старшыні Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Кітая, член Палітбюро ЦК КПК, які зачытаў прывітанне Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Кітая, У. Гамулка—першы сакратар ЦК Польскай аб'яднанай рабочай партыі, М. Тарэз—генеральны сакратар Французскай камуністычнай партыі.

Затым з'езд прадоўжыў абмеркаванне справаздачы Цэнтральнага Камітэта КПСС, праекта Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і справаздачнага даклада Цэнтральнай Рэвізійнай Камісіі КПСС. На пасяджэнні выступілі: таварышы Л. І. Брэжнеў — Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, В. П. Мжаванадзе—першы сакратар ЦК Кампартыі Грузіі, Г. І. Воранаў — намеснік Старшыні Бюро ЦК КПСС па РСФСР.

20 кастрычніка на ранішнім пасяджэнні выступілі таварышы: В. Ю. Ахундаў—першы сакратар ЦК Кампартыі Азербайджана, К. А. Фурцава — міністр культуры СССР, Л. Н. Яфрэмаў — першы сакратар Горкаўскага абкома КПСС, М. У. Келдыш—прэзідэнт Акадэміі навук СССР, Д. Расулаў — першы сакратар ЦК Кампартыі Таджыкістана.

З'езд заслухаў даклад Мандатнай камісіі з'езда, з якім выступіў старшыня Мандатнай камісіі тав. В. Н. Цітоў.

Даклад Мандатнай камісіі зацвярджаецца аднагалосна.

У канцы ранішняга пасяджэння з'езд віталі горача сустрэты дэлегатамі і гасцямі тав. Антанін Новотны—першы сакратар ЦК Камуністычнай партыі Чэхаславакіі.

На вячэрнім пасяджэнні працягвалася абмеркаванне справаздачы Цэнтральнага Камітэта КПСС, праекта Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і справаздачнага даклада Цэнтральнай Рэвізійнай Камісіі КПСС.

Затым з'езд віталі горача сустрэтыя дэлегатамі і гасцямі прадстаўнікі зарубежных камуністычных і рабочых партый таварышы: Вальтэр Ульбрыхт — першы сакратар ЦК Сацыялістычнай адзінай партыі Германіі, Пальміра Тальяці — генеральны сакратар Італьянскай камуністычнай партыі, Георге Георгіу-Дэж—першы сакратар ЦК Румынскай рабочай партыі, Янаш Кадар—першы сакратар ЦК Венгерскай сацыялістычнай рабочай партыі.

21 кастрычніка з'езд абмяркоўваў справаздачу Цэнтральнага Камітэта КПСС, праект Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і справаздачны даклад Цэнтральнай Рэвізійнай Камісіі КПСС.

На ранішнім пасяджэнні выступілі таварышы: В. В. Грышын — старшыня ВЦСПС, А. В. Гіталаў — брыгадзір трактарнай брыгады калгаса імя XX з'езда КПСС Нова-Украінскага раёна (Кіраваградская партарганізацыя), М. А. Суслаў — сакратар ЦК КПСС.

Затым з'езд віталі горача сустрэтыя дэлегатамі і гасцямі прадстаўнікі зарубежных камуністычных і рабочых партый таварышы: Тодар Жыўкаў — першы сакратар ЦК Балгарскай камуністычнай партыі, Кім Ір Сен — старшыня ЦК Працоўнай партыі Карэі, Хо Шы Мін — старшыня ЦК Партыі працоўных В'етнама, Юмжагійн Цэдэнбал — першы сакратар ЦК Манголькай народна-рэвалюцыйнай партыі.

На вячэрнім пасяджэнні з'езд віталі горача сустрэтыя дэлегатамі і гасцямі прадстаўнікі зарубежных камуністычных і рабочых партый таварышы: Блас Рока — член кіраўніцтва аб'яднаных рэвалюцыйных арганізацый Кубы, Дзіпа Нусантара Айдзіт — старшыня ЦК Камуністычнай партыі Інданезіі, Аджой Кумар Гхош — генеральны сакратар Нацыянальнага савета Камуністычнай партыі Індыі.

З'езд працягваў абмеркаванне справаздачы Цэнтральнага Камітэта КПСС, праекта Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і справаздачнага даклада Цэнтральнай Рэвізійнай Камісіі КПСС. На пасяджэнні выступілі: М. І. Ражнёва — памочнік майстра Купавінскай тонкасуконнай фабрыкі Ногінскага раёна (Маскоўская абласная партарганізацыя), А. М. Касыгін — першы намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР, Г. І. Вараб'ёў — першы сакратар Краснадарскага крайкома КПСС, Я. Н. Зарабян — першы сакратар ЦК Кампартыі Арменіі.

ВЕКАПОМНЫ ЧАС

Я пераконаны — няма чалавека, які б у гэтыя дні абыякава разгарнуў газету або, седзячы ля прыёмніка, блукаў па эфіры ў пошуках лёгкай музыкі. Гэта я гавару не толькі пра нашых сяброў, якіх мільёны ва ўсім свеце, а і пра самых лютых нашых ворагаў, якіх куды менш, хаця яны яшчэ пакуль і валодаюць пэўнай сілай.

У гэтыя дні ўсе прагна слухаюць Маскву. Ловяць кожнае слова з Масквы. Чытаюць, што адбываецца ў Маскве.

Тысячы год існавала прыказка «Усе дарогі вядуць у Рым», але колькі ўжо там было тых дарог...

Тысячы дарог вядуць у Маскву. Гэтай новай прыказцы не так ужо і многа год, але яна застанецца навекі, і ўжо ніколі не будзе забыта.

Я ўважліва і не адзін раз прачытаў праект новай Праграмы нашай партыі. Чытаючы падумаў — гэты найвялікшы дакумент адрасаваны не толькі ўсяму чалавецтву, ён адрасаваны кожнаму чалавеку асобна.

У дваццатым стагоддзі здзейсніцца тое, аб чым марылі людзі на працягу ўсіх папярэдніх дзевятнаццаці, разам узятых, а таксама яшчэ больш і больш старадаўніх часоў.

З няменшым хваляваннем і таксама не аднойчы чытаю я даклады Мікіты Сяргеевіча Хрушчова на XXII з'ездзе КПСС. Чытаю, як цудоўнейшыя паэмы, у якіх кожны радок працінае сэрца сваім дзівосна глыбокім зместам, сонечнай яснасцю думкі, адзіўляючай у самым лепшым сэнсе гэтага слова, узнёсласцю, што ўзнімае чалавека на неабсяжныя высі, і ён ясна, на свае вочы бачыць: ВОСЬ ЁН ЯКІ — КАМУНІЗМ.

Ён ужо блізкі і бачны нам. Ён велічны. У ім на дзіва ўсё гарманічна і прыгожа. Нам вельмі добра будзе жыць — гэта значыцца працаваць, бо без працы няма жыцця. Нам надзвычай лёгка будзе дыхаць, бо ніхто не адважыцца забрудзіць паветра. Нам усімі фарбамі вясёлкі будзе квітнець усё высакароднае, што можа стварыць чалавек. А чалавек можа стварыць усё.

І разам з тым я думаю: не такі ўжо вялікі прамежак часу, што аддзяляе нас ад тых светлых дзён — усяго толькі дваццаць год. А зрабіць за гэтыя гады трэба вельмі многа.

Галоўнае — выхаваць чалавека, які мог бы па праву ўвайсці ў камунізм. Гэты чалавек вонкава будзе падобны на сённяшняга, нават на ўчарашняга і пазаўчарашняга, але ўнутрана павінен быць іншым. Павінен быць новым, ачышчаным ад бруду, які напластаваўся на ім, на адным менш, на другім больш, стагоддзямі мінуўшчыны.

Я зараз заканчваю новую п'есу. Яна будзе называцца: «Небяспечна, — Мякішавы». Мякішавы — гэта людзі, якія жывуць сёння, але трымаюцца філасофіі ўчарашняй. Яны таксама рыхтуюцца ўвайсці ў камунізм. Праўдзівей — не ўвайсці, а пралезці. І абавязкова на чужым карку. Такія ўжо цяпер шукаюць найбольш зручны ход, найбольш прыдатную фарбу, каб, прыкрыўшыся ёю, змяшацца з чыстымі, вонкава быць падобнымі да іх і такім чынам прабрацца ў заўтра. Небяспечна тое, што яны імкнуцца не толькі прабрацца ў заўтра, але і захапіць, паспрабаваць захапіць там больш утульнае, цёплае месцечка.

Такія яшчэ ёсць. Свяшчэнны абавязак пісьменніка, асабліва драматурга, усімі існуючымі ў яго сродкамі выкрыць такіх, каб убачыўшы іх, людзі ведалі, з кім маюць справу — гэта значыць, ведалі, што з такімі рабіць.

У справаздачным дакладзе Мікіты Сяргеевіча на XXII з'ездзе ёсць такія словы:

«Выхаванне новага чалавека—складаны і працяглы працэс. Немагчыма механічна перасяліць людзей з царства капіталізму ў царства камунізма. Нельга браць у камунізм чалавека, які аброс мохам капіталістычных забабонаў. Трэба раней паклапаціцца аб тым, каб вызваліць яго ад грузу мінулага. Барацьба з перажыткамі капіталізму ў свядомасці людзей, змяненне выпрацаваных стагоддзямі навыкаў і нораваў мільёнаў людзей, пачатае нашай рэвалюцыяй, — справа працяглая і не простая. Перажыткі мінулага — страшная сіла, якая, як кашмар, гняце розумы жывучых. Яны карэняцца ў быце і ў свядомасці мільёнаў людзей яшчэ доўга пасля таго, як знікаюць эканамічныя ўмовы, што спарадзілі іх».

Няма больш пачэснага абавязку для пісьменніка, як дапамагчы партыі перавыхаваць такога чалавека, падрыхтаваць яго для пераходу ў камуністычнае заўтра.

І тут, у гэтым я таксама пераконаны, — новая Праграма нашай партыі, даклады Мікіты Сяргеевіча — найцудоўнейшая праграма для творчай працы кожнага мастака, невычарпальная крыніца для творчага натхнення, компас, ідучы па якому, пісьменнік-мастак ніколі не саб'ецца з правільнага шляху.

Цудоўная сёлета восень. Надзіва ясная, прыгожая, яркая. Найбольш яркімі днямі гэтай восені застануцца дні работы XXII з'езда КПСС.

Гэта сапраўды векапомны час.

Аркадзь МАЎЗОН.

РАЗАМ З НАРОДАМ

XXII з'езд КПСС абмяркоўвае велічныя пытанні пабудовы ў нашай краіне камуністычнага грамадства. І калі знаёмішся з дакладамі таварыша М. С. Хрушчова і рэальна ўяўляеш сабе, якога гігантскага росквіту дасягнуць у бліжэйшыя дваццаць год прамысловасць і сельская гаспадарка, навука і культура, мімаволі думаеш, як жа нам, творчым работнікам, трэба працаваць, каб не адстаць ад бурнага развіцця краіны.

Творчая інтэлігенцыя рэспублікі жыве інтарэсамі і спадзяваннямі шырокіх народных мас. Але зараз яна павінна яшчэ глыбей пранікнуць у жыццё людзей, ведаць іх штодзённыя культурныя і духоўныя запатрабаванні і імкнуцца заўсёды як мага лепш задаволіць іх. Толькі цесная і непасрэдная сувязь з рабочымі і калгаснікамі, з усім працоўным народам можа натхніць любога мастака-творцу на самыя трапяткія тэмы сучаснасці і падказаць найбольш правільнае іх вырашэнне ў творах мастацтва.

А колькі ў народзе ёсць таленавітых музыкантаў-самародкаў, народных стваральнікаў песень і вершаў, здольных выканаўцаў! Пазнаёмцеся бліжэй з іх прывабнай, самабытнай творчасцю і вы ўбачыце, якія незлічоныя багацці тоіць яна ў сабе і якую вялікую карысць можа прынесці нашым прафесіянальным калектывам! Народныя песні, частушкі, танцы трэба запісваць і вывучаць і, надаўшы ім прафесіянальную сцэнічную форму, шырока прапагандаваць. Нядаўна мне давялося прысутнічаць на аглядзе маладых самадзейных выканаўцаў Мінскай вобласці. Я прыйшоў у захапленне ад выступлення самадзейнай спявачкі І. Шапавалавай (Стаўбцы), якая з сапраўдным натхненнем здолела сама напісаць і выканаць частушкі пад назвай «Дзявочыя міжпланетныя». Не магу не прывесці некаторыя радкі з іх:

Космас намі заваёван,
Шлях адкрыты ўсім туды.
Скора, скора на планетах
Пабудуем гарады!

Вось вам прыклад таго, як сам народ адгукаецца на гераічныя падзеі нашага часу, ствараючы жыццярадасныя, вясёлыя частушкі і песні, упэўнена гледзячы ў светлую будучыню. Дык як пасля гэтага не збіраць гэтыя залатыя перлы нашага фальклору? Наш калектыў, побач з вялікай канцэртнай дзейнасцю, заўсёды займаецца зборам і запісам лепшых узораў народнай творчасці. Мы запланавалі паехаць на Гомельшчыну, у Веткаўскі раён, які мяжуе з Расіяй, каб вывучыць і запісаць новыя народныя песні, танцы і прасачыць на іх узаемны ўплыў дзвюх культур рускага і беларускага народаў, якія ў савецкую эпоху жывуць, як браты, і ідуць агульнымі шляхамі да камунізма.

Г. ЦІТОВІЧ,
народны артыст БССР, мастацкі кіраўнік Беларускага народнага ансамбля песні і танца.

ПРАГРАМА ЧАЛАВЕЧАГА ШЧАСЦЯ

З выключным хваляваннем чытаем мы, работнікі мастацтва, матэрыялы гістарычнага XXII з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

Веліч ідэі новай Праграмы КПСС, якая будзе зацверджана на з'ездзе, адкрывае перад намі цудоўныя перспектывы. Гэтыя ідэі яркім факелам асвятляюць нам шлях да творчасці, да высакароднага служэння свайму народу. Даклад М. С. Хрушчова аб праекце новай Праграмы—цудоўная сімфонія пераможнага руху да камунізма.

Нашым важнейшым абавязкам з'яўляецца эстэтычнае выхаванне будаўнікоў новага свету. Культура і мастацтва ў нашай краіне ва ўсіх формах, відах і жанрах існуюць для народа, і кожны з нас закліканы развіваць іх у адпаведнасці з патрабаваннямі часу.

Усведамленне высокай адказнасці перад народам дысцыплінуе мысленне мастака, натхняе на нястомныя пошукі новых нязведаных яшчэ шляхоў у мастацтве, актывізуе волю ў дасягненні мэты.

Сваёй вобразнай мовай мы раскажам аб велічы народных здзяйсненняў, пакажам са сцэны тое, чым характэрна наша непаўторная эпоха.

Натхнёныя праграмай народнага шчасця, мы ўсе свае сілы аддадзім будаўніцтву культуры камуністычнага грамадства.

Д. АРЛОЎ,
народны артыст БССР, прафесар Тэатральна-мастацкага Інстытута.

★ ★

XXII з'езд КПСС, з'езд будаўнікоў камунізма працягвае сваю работу. Разгорнута новая старонка вялікага гістарычнага летапісу чалавецтва. Праграма пабудовы камунізма, якая шырока абмяркоўваецца партыяй і ўсім народам, з'яўляецца дакументам сусветнага значэння, камуністычным маніфестам XX стагоддзя.

Ідэі камунізма як сацыяльнай тэорыі з'явіліся яшчэ ў эпоху рабаўласніцтва і, пачынаючы з часу іх узнікнення, аж праз усю гісторыю чалавецтва, яны цьмяна выказвалі імкненні працоўных да шчаслівага жыцця. Тагачасныя камуністычныя вучэнні, будучы ўтапічнымі, не маглі ўказаць працоўным сапраўднага выйсця з іх цяжкага становішча, адкрыць законы развіцця грамадства, знайсці грамадскую сілу, здольную стаць творцам новага грамадства. Іх тэорыі заставаліся толькі тэорыямі, якія праходзілі міма народных мас.

Нягледзячы на цэлую фалангу таленавітых людзей, якія выкладалі гэтыя ідэі, падкрэслівае Ленін, іх тэорыя заставалася ў баку ад жыцця, іх праграма — у баку ад народнага палітычнага руху, пакуль буйная машынная індустрыя не ўцягнула ў вір палітычнага жыцця масы рабочага пралетарыяту і пакуль не быў знойдзены сапраўдны лозунг яго барацьбы. Гэты лозунг быў знойдзены Марксам, вуснамі якога ў сярэдзіне мінулага стагоддзя абвешчана: вызваленне рабочага класа — яго ўласная справа.

Вялікая думка аб вызваленні прыгнечаных, аб новым жыцці на зямлі навукова, з геніяльнай прастатой раскрытая ў «Маніфесце Камуністычнай партыі», ахапіла сваім палымяным дыханнем масы, узняла іх на актыўную класавую барацьбу. «Маніфест» стаў жывой, баявой духоўнай зброяй працоўных.

Ул. І. Ленін, тытанічная фігура якога стаяла на парозе стагоддзя, як сімвал класа, што ўсвядоміў сваю гістарычную місію, здолеў як ніхто прымяніць тэорыю і метад Маркса, развіўшы іх далей, прыстасоўна да новай эпохі, да разумення эканамічнай і палітычнай абстаноўкі ў Расіі таго часу.

Абапіраючыся на ўзрастаючую свядомасць і рэвалюцыйнасць рабочага класа, на яго саюзніка — бяднейшае сялянства, партыя прывяла народ да перамогі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі ў нашай краіне. Падпісаннем першых дэкрэтаў Савецкай улады, складаннем канкрэтнай праграмы сацыялістычнага будаўніцтва Ленін расчыніў вароты ў будучыню, якая з туманнай мары аб камунізме стала рэвалюцыйнай практыкай, што ператварае свет.

Ленін, выходзячы з аб'ектыўнага аналізу палітычнага і эканамічнага жыцця краіны і вопыту міжнароднага рабочага руху, унёс вялікі ўклад у скарбніцу марксізма. Рабочы клас усяго свету знайшоў у Леніне не толькі свайго палітычнага правадыра, выдатнага арганізатара, але і геніяльнага тэарэтыка.

Ленінская Праграма пабудовы сацыялізма, прынятая VIII з'ездам партыі ў 1919 годзе ў выглядзе другой Праграмы, цалкам выканана: сацыялізм перамог у Савецкім Саюзе поўнасцю і канчаткова. Праграма, якая нарадзілася на VIII з'ездзе РКП(б), піша член ЦК Венгерскай сацыялістычнай рабочай партыі Ласла Хай, можа, як заслужаны ветэран, ганарыцца тым, што дасягнута камуністамі за гады Савецкай улады. Нібы маяк асвятляла яна непратаптаныя шляхі сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР. З яе дапамогаю савецкія людзі даказалі перавагу новага ладу на ўдарных будоўлях пяцігодак, на франтах Айчыннай вайны, у прасторах космасу, а цяпер яна з няменшай сілай дапамагае братнім краінам народнай дэмакратыі.

Гэты здымак зроблены ў пераплётным цэху Мінскага паліграфічнага камбіната імя Якуба Коласа. Брыгада камуністычнай працы, якой кіруе Аляксандр Агееў, знаёміцца з матэрыяламі XXII з'езда КПСС.

З'ЕЗД СВЕТЛАГА ЗАЎТРА

Ленін вучыць, што наша праграма партыі павінна быць праграмай гаспадарчага будаўніцтва, інакш яна непрыгодная і як праграма партыі. Мы абавязаны выходзіць з таго марксісцкага палажэння, якое ўсімі прызнаецца, што праграма павінна быць пабудавана на навуковым падмурку. У праграме трэба пісаць з абсалютнай дакладнасцю тое, што ёсць, патрабаваў Ленін. Тады наша праграма — неаспрэчная. Наша «праграма, — вучыць Ленін, — павінна заключаць абсалютна бясспрэчнае, фактычна ўстаноўленае, толькі тады яна — праграма марксісцкая». І толькі пры такой умове праграма партыі будзе «мацнейшым матэрыялам для прапаганды і агітацыі, будзе тым дакументам, на аснове якога рабочыя скажуць: «Тут нашы таварышы, нашы браты, тут робіцца наша агульная справа».

Праграма КПСС, якая абмяркоўваецца XXII з'ездам партыі, адпавядае ўсім тым патрабаванням, якія ставіў Ленін. У Праграме вызначаны асноўныя законы камуністычных ператварэнняў у перыяд пераходу ад сацыялізма да камунізма. Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза паказвае ўсім людзям на зямлі, што партыя самымі трывалымі сувязямі звязана з народам, чэрпае свае сілы з народных мас і глыбока верыць ім, што яна і існуе толькі для таго, каб здзейсніць спрадвечную мару працоўных: «Усё ў імя чалавека, для шчасця чалавека». Увесь змест Праграмы прасякнуты ленінскім гуманізмам, клопатамі пра чалавека, пра мір ва ўсім свеце.

XXII з'езд дае адказы на ўсе пастаўленыя жыццём, практыкай стварэння і барацьбы, новыя тэарэтычныя пытанні. Увасабляючы калектыўную думку нашай партыі, Праграма КПСС узбагачае марксізм-ленінізм вучэннем аб камунізме. У Праграме ўпершыню даецца разгорнутая характарыстыка другой фазы камуністычнай грамадска-эканамічнай фармацыі. Камунізм як вышэйшая форма арганізацыі грамадскага жыцця — гэта бясклясавы лад з адзінай агульнанароднай уласнасцю на сродкі вытворчасці, поўнай сацыяльнай роўнасцю ўсіх членаў грамадства, дзе разам з усебаковым развіццём людзей вырастуць і прадукцыйныя сілы на аснове навукі і тэхнікі, якая будзе няспынна развівацца, усе крыніцы грамадскага багацця пальюцца поўным патокам і ажыццёвіцца вялікі прынцып «ад кожнага — па здольнасцях, кожнаму — па патрэбнасцях». Камунізм — гэта высокаарганізаванае грамадства свабодных і свядомых працаўнікоў, у якім усталюецца грамадскае са-

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Гістарычны дзённік

Ен пачаўся семнаццатага кастрычніка. Сорак чатыры гады таму назад, прыкладна ў гэты ж час, пачалася Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя. Міжвольна аб гэтым успамінаецца кожны раз, калі слухаеш дзённік тых гістарычных падзей, якія адбываюцца цяпер у Крамлёўскім Палацы з'ездаў, калі чытаеш матэрыялы з'езда, асабліва глыбокія, надзвычай эмацыянальныя даклады Мікіты Сяргеевіча Хрушчова.

Што б ні было ў цябе на стале, якой бы тэрміновай справай ты ні быў заняты, усё роўна адкладзеш яе, каб паслухаць дзённік з'езда або паглядзець па тэлевізару. І гэтак, пэўна, у кожнага савецкага чалавека, у кожнага сумленнага чалавека ва ўсім свеце. Душа не можа не радавацца ад усведамлення, што на тваіх вачах, пры тваім, няхай самым сціплым, удзеле адбываецца нешта да таго вялікае і грандыёзнае, што яго глыбокі след застанецца ў вяках. Гэты дзённік, які мы цяпер слухаем, будуць вывучаць многія пакаленні.

Мы, старэйшыя па ўзросту людзі, перажываем цяпер асабліва натхнёныя і хвалюючыя гадзіны. Не кожны з нас мог прыняць непасрэдны ўдзел у тым Вялікім Кастрычніку, які адбыўся сорак чатыры гады таму назад. Іншаму гадоў тады не хапала, а, можа, каторому і належнай свядомасці. Аднак мы памятаем тыя гады, асабліва гады грамадзянскай вайны і станаўлення Савецкай улады. Ніколі не забудзецца, як узніміліся лепшыя людзі на рашучую барацьбу за сваё шчасце, за радасць сваіх дзяцей і ўнукаў. Ніколі не забудуцца незлічоныя ахвяры, якія панёс наш народ у вялікай схватцы з сусветным імперыялізмам, а потым у гераічнай бітве з сусветным фашызмам.

І вось новы кастрычнік 1961 года. Як пераўтварылася, як закрасавала ў шчасці наша вялікая Радзіма! Кожны савецкі чалавек — удзельнік нашага натхнёнага, грандыёзнага будаўніцтва. Гэтак жа сама кожны з нас можа лічыць сябе і ўдзельнікам XXII з'езда, які закладвае трывалы і непахісны падмурак будаўніцтва камунізма. Мы слухаем гістарычны дзённік і адчуваем, што прысутнічаем там, у Крамлёўскім Палацы, разам з нашымі дэлегатамі абмяркоўваем справаздачу ЦК КПСС і вялікую Праграму пабудовы камунізма.

І мы адчуваем шчасце, што і самі яшчэ будзем жыць пры тым новым грамадстве, асновы якога закладваюцца на XXII з'ездзе нашай партыі, — пры камунізме. Хочацца прыкласці ўсе свае сілы, усе свае здольнасці, аддаць усё, што ў цябе ёсць, каб гэтая светлая пара настала хутчэй, каб наша краіна і надалей служыла яркім маяком для ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва нашай планеты.

Аляксей КУЛАКОЎСКІ.

ВЯЛІКАЯ МЭТА

Зайздрошчу дэлегатам XXII з'езда! Яны прысутнічаюць пры нараджэнні вялікага твора сусветнага значэння—новай Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Кожны параграф гэтага дакумента, кожная літара і лічба гавораць пра перамогу ідэй марксізма-ленінізма ў нашай краіне. У гэтым вялікім дакуменце, у стварэнні якога прымаў удзел увесь народ, запісаны самыя запаветныя думкі людзей свабоднай працы. У гэтым творы—спадзяванні прыгнечаных усяго свету.

Уяўляецца, якім яшчэ больш цудоўным стане наша жыццё літаральна праз некалькі год...

«Ужо на працягу першых дзесяці гадоў усе слаі савецкіх людзей здолеюць карыстацца дастаткам, будуць матэрыяльна забяспечаны».

«...усе слаі насельніцтва здолеюць карыстацца добрым, высакаякасным харчаваннем»; «...усе савецкія людзі здолеюць набываць у дастатку прадметы шырокага ўжытку, а ў наступным дзесяцігоддзі попыт на іх будзе задавальняцца поўнасцю».

«На працягу бліжэйшага дзесяцігоддзя мы павінны пакончыць з недахватам жылля. У выніку другога дзесяцігоддзя кожная сям'я будзе забяспечана асобнай добраўпарадкаванай кватэрай...»

Будзе скарачацца працоўны дзень; будзе павялічвацца працягласць аплачваемага адпачынку; знікне катэгорыя нізкааплачваемых рабочых і служачых; будзе забяспечана поўнае ўтрыманне за кошт грамадства ўсіх непрацаздольных...

Ці ж не паэзія ў гэтых запісах!

Ці ж не тыя гэта вызначэнні, надыход якіх прадказваў Ленін, за здзяйсненне якіх людзі гібелі ў царскіх турмах, змагаліся на рыштаваннях пяцігодак і сямігодкі, гінулі ў баях з фашыстамі-цемрашаламі!..

Наша родная Камуністычная партыя робіць усё для таго, каб квітнела жыццё ў нашай краіне, каб нашы людзі працавалі спакойна, каб з кожным днём шырылася кола нашых сяброў за межамі краіны. Мы, простыя працаўнікі, адчуваем гэта штодзённа і ўдзячны партыі за яе вялікія клопаты аб народзе. Такія ж пачуцці выказваюць нашы сябры ў краінах сацыялістычнага лагера, чые дэлегацыі прыбылі на XXII з'езд.

Зусім нядаўна, у верасні, мне давялося пабываць у дзвюх братніх краінах—Чэхаславакіі і Венгрыі. Радасна было бачыць, як хораша жывуць нашы сябры, якіх вялікіх поспехаў дасягнулі яны на шляхах сацыялізма! Чэхі і славакі з гонарам гаварылі нам, што іх рэспубліка называецца сацыялістычнай... У Празе, пры ўваходзе ў Нацыянальны музей-бібліятэку, мы прачыталі яркі транспарант: «Сёння—сацыялізм, заўтра—камунізм!» Гэта сапраўдны дэвіз нацыі і дзяржавы, якая ідзе шляхамі Краіны Саветаў. Пачуцці дружбы да савецкіх людзей, якія паказваюць прыклад у барацьбе за камунізм, словы ўдзячнасці савецкаму народу і Камуністычнай партыі гучалі і на мітынгу дружбы ў рабочым горадзе Мілеўско, на сустрэчах з казператарамі вёскі Радманаў і іншых.

У Будапешце адбылася сяброўская сустрэча з рабочымі сусветна вядомага лікёрнага завода. На заводзе працуюць у асноўным жанчыны. Сакратар партыйнай арганізацыі—жанчына, брыгадзіры—жанчыны, дырэктар прадпрыемства—таксама жанчына, зусім яшчэ маладая для такой пасады, мая равесніца... Ці трэба тлумачыць, аб чым гаварылі мы з венгерскімі сяброўкамі! Мы гаварылі аб міры, аб каханні, аб любімай рабоце, марылі пра будучыню... Дамовіліся, што на агульным шляху, разам нам ніякія перашкоды не страшныя!

Кожны дзень я з нецярплівасцю ўключаю радыё і слухаю весткі са з'езда—і весткі гэтыя гучаць у сэрцы цудоўнай музыкай...

Я веру, што нашы планы здзейсняцца. Веру ў блізкі надыход камунізма.

Еўдакія ЛОСЬ.

Сцяпан ГАЎРУСЕЎ

НАМ БУДУЧЫНЯ РУКІ ПРАЦЯГНУЛА

Як на уступах горных альпіністы,
Каб век не адступіцца ад свайго,
Трымаюцца з'яднана камуністы:
Адзін—за ўсіх, усе—за аднаго.

Калі з сяброў не падвядзе
ніводны,
Усім ступаць надзейней і лягчэй
Да тых вяршынь, дзе дапягляд
свабодны
Адкрыецца для здзіўленых вачэй.

І вось, не пераводзячы дыхання,
Мы на хрыбет вышэйшы узышлі,
Дзе бачны скрозь аблокаў
калыханне
Абсяг шырокі бацькаўскай зямлі.

Не міг адзін захочаш аглядзецца,
І зноў—у шлях, бо зноў перад
табой
Твой цень на стромы новыя
кладзецца,
Каб ты адолеў іх цаной любой.

І зноў—у шлях, і зноў—ідзеш
бясконца,
Зара шуміць гарачым кумачом,
Смялей, смялей, пакуль самое
сонца
Прыўзнімеш вышай маладым
плячом!

Нас у дарозе стома не сагнула,
Нас ні вятры, ні кручы не
змаглі,—
Нам будучыня рукі працягнула,
Каб да яе бадзёрымі дайшлі.

Добры настрой у муляра Мікалая Вучко, члена брыгады, якая змагаецца за званне камуністычнай. Стаўшы на працоўную вахту ў гонар XXII з'езда роднай Камуністычнай партыі, ён выконвае зменнае заданне на 140—150 працэнтаў.

Разам са сваімі таварышамі Мікалай будуе ў Мінску новы будынак Беларускага дзяржаўнага гісторыка-краязнаўчага музея.

Фота Я. КОГАЛЯ.

З'ЕЗД СВЕТЛАГА ЗАЎТРА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

макіраванне; праца на карысць грамадства стане для ўсіх першай жыццёвай патрэбай, усвядомленай неабходнасцю; здольнасці кожнага будуць прымяняцца з найбольшай карысцю для народа.

Побач з агульнай характарыстыкай грамадства, у Праграме вызначаны шляхі стварэння матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма, ператварэння сацыялістычных вытворчых адносін у камуністычныя. Ставіцца задача сусветна-гістарычнага значэння — забяспечыць у нашай краіне самы высокі жыццёвы ўзровень у параўнанні з любой капіталістычнай дзяржавай. Рэальнасць намечанай мэты абумоўліваецца ўсім комплексам вызначаных у Праграме мерапрыемстваў: стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма выкліча бурнае і нябачанае развіццё прадукцыйных сіл, небывалы ўздым прадукцыйнасці працы, што з'явіцца асновай ператварэння сацыялістычных грамадскіх адносін у камуністычныя. Аб'ём нацыянальнага даходу СССР у бліжэйшыя дзесяць год павялічыцца амаль у два з палавінай раза, а за дваццаць год — прыкладна ў пяць разоў. Такім чынам, рэальныя даходы на душу насельніцтва за дваццаць год узрастуць больш чым у тры з палавінаю раза. На працягу першага дзесяцігоддзя ажыццёвіцца пераход на шасцігадзінны рабочы дзень, а ў другім дзесяцігоддзі пачнецца пераход да яшчэ больш скарочанага рабочага тыдня. Выкананне асноўнай эканамічнай задачы дазволіць забяспечыць за кошт грамадства бясплатнае ўтрыманне дзяцей у дзіцячых установах і школах-інтэрнатах, матэрыяльнае забеспячэнне непрацаздольных, бясплатную адукацыю ва ўсіх навучальных установах, бясплатнае медыцынскае абслугоўванне, уключаючы медыкаменты, санаторнае лячэнне, бясплатнае карыстанне каатэрамі, камунальнымі паслугамі, камунальным транспартам, бясплатнае карыстанне дамамі адпачынку, турысцкімі базамі, пераход да бясплатнага грамадскага харчавання і г. д.

У свой час Маркс пісаў, што апошняя мэта камунізма ёсць вышэйшае развіццё багацця, а калі некаторым здаецца, дадае ён, што гэта вельмі вузкае эканамічнае вызначэнне, дык я растлумачу, што пад багаццем я разумею найбольшае развіццё ўсіх закладзеных у чалавеку здольнасцей, а развіццё чалавечых здольнасцей — разумовых, мастацкіх, жыццёвых — гэта і ёсць культура.

Як у праекце Праграмы, так і ў рабоце XXII з'езда шмат аддаецца ўвагі праблеме выхавання новага чалавека з камуністычнымі рысамі характару, чалавека-творцы, гуманіста, гарманічна развітага індывідуума. Раскрыты эканамічныя, палітычныя і ідэалагічныя ўмовы, якія вызначаюць рух нашай краіны да светлай будучыні ўсяго чалавецтва.

Праграма КПСС — выдатны тэарэтычны і палітычны дакумент сучаснай эпохі, у якім атрымліваюць далейшае развіццё ўсе асноўныя пытанні марксісцка-ленінскай тэорыі прыстасоўна да новых гістарычных умоў.

XXII з'езд носіць сапраўды творчы характар, ён прасякнуты баявым ленінскім духам. З'езд — увасабленне запаветаў Леніна, дэманстрацыя ўсёперамагаючай сілы ленінізма.

У свой час Ленін гаварыў: «...узяць просты лік з'ездаў, — ні адна дзяржава за сто гадоў дэмакратызму столькі не склікала, а імённа такім шляхам мы выпрацоўваем агульныя рашэнні і выкоўваем агульную волю». На гэтай найшырэйшай базе дэмакратызму ўмацоўваецца ўлада працоўных. Наша канстытуцыя дае тое, што «рашэнні Савецкай улады маюць нябачаную ў свеце сілу аўтарытэту, сілу рабочых і сялян».

Велічны план будаўніцтва камунізма, намечаны ў праекце Праграмы КПСС, толькі ў нашай рэспубліцы абмяркоўваўся на 8 635 партыйных сходах і на 14 923 сходах працоўных, на якіх прысутнічала звыш аднаго мільёна 800 тысяч чалавек і выступіла каля 112 тысяч камуністаў і беспартыйных.

З'езд з'яўляецца выдатнай гістарычнай надзеяй не толькі ў жыцці нашай краіны, але і ва ўсім міжнародным рабочым руху. Увесь змест праекта Праграмы і работа з'езда дэманструюць гістарычную праўдзівасць марксісцка-ленінскай навукі, якая адлюстроўвае жыццёвыя інтарэсы рабочага класа, пераважнай большасці чалавецтва. Уздзеянне XXII з'езда на розумы працоўных мас ва ўсім свеце цяжка пераацаніць: яно ва ўсёй велічы раскрывае пераможную сілу навуковага камунізма.

«XXII з'езд КПСС, які прымае гэтую Праграму, — піша Іржы Гендрых, член Палітбюро ЦК КП Чэхаславакіі, — стане вялікай гістарычнай вехай, ад якой шлях пойдзе проста ўжо да вяршынь камунізма».

«Няхай савецкі народ ведае, што ва ўсім свеце і ў Індыі ёсць мільёны і мільёны людзей, якія заўсёды з ім і якія ў выпадку неабходнасці ахвяруюць усім для таго, каб вялікі савецкі народ мог выканаць сваю гістарычную задачу», — заявіў індыйскі эканаміст Х. Д. Малавія.

Сакратар Нацыянальнай канфедэрацыі рабочых металургічнай і машынабудаўнічай прамысловасці Італіі Рэната Капелі сказаў: «Новая Праграма КПСС — гэта сапраўды пуцяводная зорка, якая асвятляе працоўным усяго свету дарогу да новага жыцця». Праграма савецкай Камуністычнай партыі, пісаў прэзідэнт «Амерыкана-рускага інстытута» Холанд Робертс, — «гэта вялікая хартыя асноў гуманізму, красамоўны і яркі маніфест праў чалавека». «Праграма КПСС — гэта важкае навуковае пацвярджэнне магутнасці сацыяльных сіл, якія выступаюць у сусветным маштабе супраць вайны, рэакцыі, нацыянальнага прыгнёту і імперыялізму» («Уоркер», орган камуністычнай партыі ЗША).

Практыка рэвалюцыйнай перабудовы грамадства ў СССР і краінах народнай дэмакратыі, стала ўладаром думак усяго прагрэсіўнага чалавецтва, натхніцелем мільёнаў людзей на барацьбу за светлую будучыню. Нават праціўнікі камунізма, як амерыканскі публіцыст Сульцбергер, вымушаны прызнаць, што капіталістычны свет не ў стане выставіць ідэі, якая павяла б за сабой народныя масы: «Мы па-ранейшаму не ў стане ні вызначыць нашы ўласныя ідэі, ні зрабіць іх зразумелымі для тых, прыхільнасці якіх мы дамагаемся».

У свеце ідзе вострая барацьба дзвюх ідэалогій. Увесь свет з'яўляецца сведкам сапраўднага трыумфу марксізма-ленінізма і адначасова глыбокага крызісу буржуазнай ідэалогіі. Невыпадкова трубадуры імперыялізму і каланіялізму адкрылі кампанію хлусні і паклёпу вакол работы XXII з'езда і праекта Праграмы КПСС. У страху перад непазбежнасцю краху імперыялізму, яны спрабуюць запаліцаваць «жахамі» камунізма, пры якім нібы «механічнасць заняволіць усё чалавецтва», камунізм пагляне свабоду, «людзі стануць падобныя на рэчы», а «народы створаць карціну штампаванай рамесніцкай аднастайнасці». Усё гэта накіравана на тое, каб ашукаць масы пры дапамозе ідэалагічных выкрутасаў, задушыць у працоўных энергію да барацьбы, абмежаваць іх інтарэсы і паказаць бесперспектыўнымі творчасць мас і рух грамадства. Ленін пісаў, што калі імперыялісты «супраць нас не могуць пайсці зараз са зброяй у руках, то ідуць са зброяй хлусні і паклёпу».

XXII з'езд паказвае велічную перспектыву далейшага грамадскага развіцця, асвятляе надзейны шлях да шчаслівага жыцця, да свабоды, роўнасці і шчасця ўсіх народаў.

У лагеры імперыялізму вымушаны абмяжоўваць і нават ліквідаваць дэмакратычныя свабоды, замоўчваць сацыяльныя вынікі беспрацоўя, жабрацтва. Яны баяцца вялікай сілы прыкладу жыцця працоўных СССР. Вось чаму імперыялістычная буржуазія, прыкрываючыся «чыстай» дэмакратыяй, толькі і робіць, указваў Ленін, што «фабрыкуе снарады для знішчэння людзей», прапавядуе «самыя рэакцыйныя ідэі, рэлігію, цемрашальства, абарону эксплуататараў і т. п.».

Прагрэсіўныя людзі ўсіх краін бачаць, што прыклад Савецкага Саюза ўказвае правільны шлях для чалавецтва.

Камунізм — гэта цяпер не далёкая мара, а наша блізкае заўтра. Ён вырастае са старанной працы савецкіх людзей. Гэта — творчасць мільённых мас народа. Пабудова камунізма, гаворыць М. С. Хрушчоў, не з'яўляецца нечым фантастычным, недаступным разуменню радавога чалавека. Будаўнікі камунізма — гэта ўсе працоўныя нашай краіны, чые думкі знітаваны з думкамі партыі. І гэта, гаворыць Хрушчоў, самая вялікая ўзнагарода для нашай партыі, гэта вялікі трыумф ленінскага вучэння, калі праграма партыі, тэорыя камуністычнага грамадства перасталі быць толькі навуковым дакументам, а сталі дакументам самога жыцця, поглядамі, разуменнем, праграмай дзейнасці нашага вялікага народа.

К. БУСЛАЎ.

Цікавая сустрэча

Многалюдна было ў актавай зале Мінскай вышэйшай партыйнай школы. У госці да слухачоў прыйшлі пісьменнікі і артысты Тэатра імя Янкі Купалы.

З чытаннем новых твораў выступілі Мікола Аўрамчык, Іван Мележ, Аляксей Кулакоўскі, Уладзімір Корбан.

У выкананні артыстаў В. Галіны, Т. Шашалевіч, З. Стомы, Г. Манаравай былі паказаны сцэны са спектакляў «Вострай Афрадзіты», «Лявоніха на арбіце».

Гэтая цікавая сустрэча была прысвечана адкрыццю XXII з'езда роднай Камуністычнай партыі.

П. ШАУЦОЎ,
слухач Мінскай ВПШ.

Падзеі Тыдня Навіны

□ Добры падарунак атрымалі маленькія жыхары гарадскога пасёлка Гарадзішча. Тут адкрыўся філіял баранавіцкай музычнай школы. Арганізаваны два класы: баяна і фартэпіяна. У школе займаецца звыш 30 вучняў.

□ У Мінску адбыліся гастролі саліста Вялікага тэатра Саюза ССР заслужанага артыста РСФСР Івана Скапцова. У суправаджэнні аркестра артыст выканаў рускія народныя песні, арыі з опер і рамансы.

□ Спектаклем «Лявоніха на арбіце» па п'есе А. Макаёнка пачаў свой сезон Магілёўскі абласны драматычны тэатр.

У рэпертуары тэатра: «Усё застаецца людзям» А. Алешына, «Аніяк» А. Штайна, «Антэі» М. Зарудная, «Сумленнасць» А. Сафронава, «Провады белых начэй» В. Пановай і інш.

З ПЕСНЯЙ АБ РОДНАЙ ПАРТЫІ

Эдуард Якаўлевіч Логаш, якога вы бачыце на здымку, вядомы на Гомельшчыне самадзейны кампазітар. З 1950 года ён працуе байяністам пры Палацы культуры Гомельскага шклозавода імя Сталіна. Пісаць музыку Логаш пачаў не так даўно — в 1956 годзе. За гэты час ім напісана нямала песень, сярод якіх асабліва вылучаюцца «Зімушка-зіма» (на словы М. Рылянкова), «Дарога» (словы П. Пранузы), «Песня пра Барыкіна» (словы М. Даніленкі), «Салдацкі танец» (на словы С. Гаўрусёва).

— Такая выдатная падзея, як XXII з'езд партыі хвалюе мяне, як і ўсіх савецкіх людзей, — гаворыць Эдуард Логаш. — Хочацца скласці такую песню аб роднай партыі, каб яна палюбілася народу.

Самадзейны кампазітар заканчвае зараз працу над песняй аб партыі на словы паэта Петруся Броўкі.

Тэкст і фота М. ПЯТРОВА.

Канферэнцыя чытачоў

У Пухавіцкім раённым Доме культуры днямі адбылася канферэнцыя чытачоў газеты «Літаратура і мастацтва».

З цікавымі прапановамі і заўвагамі аб матэрыялах газеты выступілі самадзейны мастак Л. Дубоўскі, мастацкі кіраўнік РДК В. Мазанік і загадчык бібліятэкі С. Чыбісава.

Супрацоўнік рэдакцыі газеты Ул. Бойка расказаў аб планах работы рэдакцыі. З чытаннем вершаў выступілі паэты А. Русак, С. Шушкевіч і мясцовы настаўнік З. Бірала.

НАША РАДАСЦЬ, НАДЗЕЯ

Краіна перажывае знамянальныя дні. У Маскве працуе XXII з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

З'езд прыме новую Праграму. Мне гэтая Праграма ўяўляецца як найвялікшы твор, у якім увасоблены розум і натхненне, сіла і празарлівасць лепшай часткі чалавецтва.

Камунізм — гэта наша любоў.
Наша радасць,
надзея
і ява.
Не зусім зразумелы ён тым,
Хто загразе у мяшчанскім
балоце.
Наша мара — не прывідны дым,
А ракета ў далёкім палёце.
Камуніст — з неспакойнай
душой.
Ён за праўду адказны на свеце.
Колер сцягу Радзімы маёй —
На чырвоным партыйным
білеце.

Вялікія і адказныя задачы ставіць перад намі партыя ў галіне выхавання камуністычнай свядомасці. «У перыяд пераходу да камуніяма ўзрастаюць магчымасці выхавання новага чалавека, які гарманічна спалучае ў сабе духоўнае багацце, маральную чысціню і фізічную дасканаласць».

Неяк я пабывала ў адной са школ-інтэрнатаў Мінскай вобласці. У новых класах і добра абсталяваных майстэрнях вучацца, набываюць працоўныя навыкі будучыя будаўнікі Камунізма.

Выхаванцы школы-інтэрната — працавітыя, беражлівыя, з пачуццём калектывізму, з добрым таварыскім сэрцам: кожны за ўсіх, усе за аднаго!

Дзеці выхоўваюцца ў духу ўзаемнай дапамогі, сумленнасці і праўдзівасці. Яны маюць усе магчымасці развіваць свае здольнасці ў музыцы, жывапісу, літаратуры, тэхніцы.

Тут ажыццяўляецца камуністычны прынцып «усебаковага і гарманічнага развіцця чалавечай асобы».

А што сказала наша літаратура аб гэтых парастках будучыні? Недаравальна мала!

Недарма зімою гэтага года, у час сустрэчы пісьменнікаў з выхавальнікамі школ-інтэрнатаў рэспублікі, нам давялося выслухаць горкія, але слушныя папрокі ў адрас пісьменнікаў, якія пішуць для дзяцей і юнацтва...

Некалькі дзён назад у рэспубліканскай піянерскай газеце «Зорка» выступіў Герой Сацыялістычнай Працы, делегат XXII з'езда партыі А. Віташкевіч. Ён звярнуўся да юнай змены з наступнымі словамі:

«Радасна, калі твая праца ўліваецца ў працу тваёй рэспублікі. Імкнешся сваёй работай прынесці яшчэ большую карысць грамадству. Во камунізм пачынаецца сёння. І наколькі ты добра папрацаваў, настолькі наблізіў свае светлае заўтра».

Гэта цудоўны водгук на залатыя словы праекта Праграмы КПСС, які ў перадз'ездаўскія дні абмяркоўвала ўся краіна:

«Праца па здольнасці стане прывычкай, першай жыццёвай патрэбай усіх членаў грамадства».

Працоўны чалавек — герой нашага часу. І вельмі важна, каб творы для дзяцей і юнацтва, прысвечаныя гэтаму герою, былі вартымі яго.

КПСС падкрэслівае вялікую ролю школы, «якая заклікана прывіваць дзецям любоў да працы, да ведаў, фарміраваць маладое пакаленне ў духу камуністычнай свядомасці і маралі. Ва ўсім гэтым высокая, пачэсная і адказная роля належыць народнаму настаўніку, камсамольскай і піянерскай арганізацыі».

Гэтыя словы, безумоўна, датычаць і пісьменнікаў, якія прысвячаюць свае сілы і здольнасці выхаванню падрастаючага пакалення. Ад літаратуры шмат у чым залежыць духоўнае аблічча людзей, якія будуць жыць і працаваць у камуністычным грамадстве.

Кніга, напісаная празрыстай мовай, з душой, з выдумкай, з адчуваннем сучаснасці, заўсёды знойдзе водгук у дзіцячым сэрцы. Аб чым мараць, да чаго імкнуцца героі нашых будучых кніг?

Дамо слова аднаму з іх — вучню быхаўскай першай школы Толю Пажараву:

«Раней мне заўсёды здавалася, што я нарадзіўся занадта позна. Адкрыты Паўночны і Паўднёвы полюсы, асвоена цаліна, пабудаваны атамны ледакол «Ленін», зрабілі свае бяспрыкладныя палёты ў космас Ю. А. Гагарын і Г. С. Цітоў. А я ні ў чым не паспеў прыняць удзелу. Крыўдна...

Але цяпер бачу я, што мае крыўды былі смешнымі. Для мяне і маіх сяброў-аднагодкаў знойдзецца многа-многа справ! Нам давядзецца дабудаваць светлы будынак камунізма, мы будзем жыць у ім».

А вось што гаворыць магілёўскі школьнік Мікола Бязлепкін:

«Мы вельмі любім сваю настаўніцу Вольгу Паўлаўну Бузніцкую. Мне здаецца, што чалавек камуністычнага грамадства абавязкова будзе падобным да Вольгі Паўлаўны. Ён будзе сумленным, сціплым, працавітым, усе сілы і ўменне будзе аддаваць людзям. Мы жадаем быць сапраўднымі людзьмі».

Знайсці ключ да сэрца юнага чытача, запаліць у юнай душы агонь вялікага жыцця! Вось пра што думаецца ў гэтыя дні.

Вялікае шчасце для пісьменніка — выхоўваць чалавека, свабоднага ад дробнаўласніцкіх звычак, эгаізму, рэлігійных забабонаў, ад нацыянальнай і расавай непрыязні, — чалавека-летуценніка, будаўніка, змагара.

Мяне вельмі радуе, што многія людзі, імкнучыся працаваць усё лепш на карысць грамадства, ставяць перад сабой задачу — авалодаць вышынямі культуры і мастацтва.

У канцэртных залах, на мастацкіх выстаўках, на літаратурных вечарах усё часцей бывае працоўная моладзь: зацікаўленыя, яркія вочы, адухоўленыя твары.

Разуменне сапраўднага мастацтва, любоў да яго становяцца неабходнасцю, неад'емнай часткай савецкага быту.

Але, на вялікі жаль, у нашым жыцці сустракаецца і іншае.

У пагоні за так званай модай некаторыя захапляюцца «модным» плынямі, якія не маюць нічога агульнага з мастацтвам. Зусім нядаўна мне давялося пасправацца з пафасным, эмацыянальна-ўзнёслым, але пустым, бяздушным, фармальна-дасканалым, але мертвым, бяздушным, фармальна-дасканалым, але мертвым, бяздушным, фармальна-дасканалым, але мертв

ТВОРЧАЕ ДЫХАННЕ

Піліп ПЕСТРАК

НЕВЯЛІКІ зборнік апавяданняў Янкі Скрыгана «Скажы адно слова»—вынік руплівай працы. Янка Скрыган—шукальнік сваёй тэмы, і гэта сведчанне творчай сталасці пісьменніка.

Апавяданні зборніка вызначаюцца тонкай архітэктонікай, яны пазбаўлены спрошчанасці—гэтага біча мастацтва. Аўтар перадае асяроддзе і людзей у ім так асцярожна, нават, я б сказаў, далікатна, каб не «пакрыўдзіць» чымнебудзь сваіх герояў, каб расказаць пра іх сапраўды па-чалавечаму, ахапіўшы ўсю гаму ўласцівых ім пачуццяў, думак. І, можа, таму так гарманіруюць у яго прозе апавядальнасць, псіхааналіз, лірыка, пафас, разваги, абагульненні і г. д. Творчая манера Янкі Скрыгана — арыгінальная і цікавая. Ён не хоча быць паўтаральнікам каго-небудзь. Тое, што ёсць у зборніку, здабыта, знойдзена Ім самім і перададзена з такою празрыстаю лёгкасцю, што, здаецца, кожны абзац, сказ, слова свецяцца чысцінёю, выразнасцю, як тыя зграбныя цаглінкі ў дбайна пабудаваным доме.

Такая ахайная работа над творамі—вынік высокай пісьменніцкай культуры аўтара, якую ён нястомна развівае. Асабліва старанна працуе аўтар над мовай. Умельства заўважаць у мове народа патрэбнае, так, як гэта робіць Скрыган,—гэта адчуванне народнай моўнай плыні, якая нічога агульнага не мае з ніякімі літаратурнымі штампамі. Бо сама народная моўная плынь і ёсць творчасць—штодзённая, масавая, дзе слова, перш чым стане словам для ўсіх, павінна адшліфавацца ў народных гушчах, як той каменьчык у марскіх хвалях. Тэндэнцыя карыстацца такою моваю, якою гаворыць народ, і перадаць яе пісьменна—бадай і з'яўляецца асноўнай адметнай рысай стылю Скрыгана.

Янка Скрыган намагаецца выпісаць лінію сюжэта, здаецца, да апошняй дробязі, але разам з тым мы не бачым ні нагрувашчвання, ні вялікіх адступленняў. Такое пачуццё меры стварае лёгкасць, якая, аднак, не шкодзіць сур'ёзным думкам глыбока грамадскага значэння. Спалучаць лёгкасць выкладання з сур'ёзнасцю зместу — значыць імкнуцца да высокай мастацкай прастаты.

Але такое стаўленне да жывой моўнай плыні, якое назіраем у творчасці Скрыгана, мае, бадай, і сваю небяспеку. Шукаючы народныя перлы ў мове, можна зачапіцца і за архаізмы. Калі, напрыклад, Скрыган у апавяданні «У Кірылы на хутары» піша пра дзяўчыну, што яна «ўся круглявая і варушкая», мы цалкам прыймаем гэтую ўдалую знаходку. Але вось у сказе «... між каляін і на ўзмежках яркла яшчэ маладым, але туга набрынялым сокам трава» — слова «яркла» выглядае архаічным, хоць гучыць змястоўна. Калі яно і ўжываецца на Беларусі, дык, відаць, мала дзе. Яно патрабуе тлумачэння. На маю думку, добра, напрыклад, робіць Скрыган, калі замест слова «атрымаць» піша «палучыць». Гэта з давён-даўна цалкам адпавядае моўнаму слоўніку беларускага народа. Слова «атрымаць» прыўнесена ў літаратуру мовазнаўцамі і яшчэ да гэтага часу аддае штучнасцю. З усіх апавяданняў у зборніку (а іх —восем і тры замалёўкі) па свайму зместу і мастацкім узроўні вылучаюцца тры найбольшых па памеры: «Няпрошаная сляза», «Наталя» і «Скажы адно слова». Хоць кожнае з іх па-свойму адметнае, самастойнае па зместу, аднак выглядаюць яны як часткі адной аповесці. Іх спалучае тэматыка, стыхія пачуццяў герояў, каларыт асяроддзя. У двух з гэтых апавяданняў («Няпрошаная сляза» і «Скажы адно слова») паўтараюцца тыя самыя персанажы (Марына Барысаўна, Собіч). Тэма гэтых апавяданняў—героіка нашых будняў, дзе асабістае цесна пераплятаецца з грамадскім, сцвярджэнне таго, што праца ў сацыялістычным грамадстве павінна быць творчай. Янку Скрыгану ў гэтых трох апавяданнях удалося добра расказаць пра творчы працэс сярод «мёртвых» лічбаў, пра яго ўдзельнікаў—галоўнага бухгалтара Собіча і Казіміра ў апавяданні «Наталя».

Творчыя намаганні галоўбуха Усевалада Собіча ў апавяданні «Няпрошаная сляза» выяўляюцца ў імкненні дамагацца ад людзей разумнага, сумленнага выканання сваіх функцый на заводзе. Тады і зарплата рабочым будзе цалкам забяспечана, тады не будзе дэбітораў, не будзе даўгоў і г. д. Прадпрыемства будзе ісці да заўтрашніх дасягненняў поўным размахам, без скрыгату, без зрываў і надрываў. І поспех у такіх выпадках забяспечаны. Творчыя імкненні галоўбуха Собіча натыкаюцца на перашкоды і з боку дырэктара завода, і з боку іншых. Гэта—людзі, якія прывыклі жыць сумленныя і сціплыя людзі. Яны лічылі, што недастаткова падрыхтаваны да таго, каб насіць высокае званне камуніста. І яны заваёўвалі гэтае званне цаною жыцця.

Гітлераўскія цемрашалы разумелі выключную ролю камуністаў у жыцці і ў барацьбе нашай арміі. Вось чаму з людаедскім цынізмам яны аддавалі розныя загады аб неадкладных расстрэлах палонных палітработнікаў Чырвонай Арміі. Так рабілі і іх наймітьі — гнусныя здраднікі народа — на акупіраваных тэрыторыях. Усе памятаюць нядаўні суд над адным з такіх здраднікаў, які ў гады вайны выдаў фашыстам юных падпольшчыкаў Обаля. Сярод дзесяткаў людзей, асабіста ім расстраляных, былі і людзі, якія вучыліся некалі разам з ім у адной і той жа школе. Суддзя запытаў у яго:

— Як жа ўзнялася ваша рука на гэтых людзей? Яны ж былі калісьці вашымі школьнымі таварышамі, а вы іх расстралялі...

Прыпёрты да сцяны кат прададзіў праз зубы:

— Яны былі камуністамі...

Гітлерызм баяўся камуністаў. Ён ведаў, што камуністы — смяротныя ворагі фашызму, як і непрымірымыя ворагі ўсякага іншага зла, прыгнечання, несправядлівасці на зямлі. Сілы камунізма атрымалі рашаючую перамогу над фашысцкім цемрашальствам, над ізуверскім чалавеканенавісніцтвам, якія з'яўляліся найвялікшай пагрозай чалавецтву і яго культуры. Камунізм перамог. Ён не мог не перамагчы, бо ўсё, за што змагаецца ён, робіцца ў імя чалавека, на карысць чалавека.

МІНУЛА БОЛЬШ чатырох дзесяцігоддзяў з дня Кастрычніка. Непазнавальнай стала наша Радзіма, яна ператварылася ў адну з самых магутных дзяржаў свету з самай перадавой культурай. Нязмерна вырас аўтарытэт нашай дзяржавы, яе роля, яе ўплыў на лёс усяго свету, на далейшае развіццё ўсяго чалавечага грамадства. Усё гэта — вынік гіганцкага подзвігу савецкага народа, які пад кіраўніцтвам сваёй роднай Камуністычнай партыі пабудаваў сацыялізм у сваёй краіне.

Разам з савецкім народам, рука аб руку, плячо ў плячо з ім будуюць сацыялізм мільёны і мільёны працоўных Кітая, Польшчы, Чэхаславакіі, Балгарыі і многіх іншых краін, якія аб'ядналіся ў магутны лагер сацыялізма. Гэта мільярд самаадданых будаўнікоў новага свету. Сацыялізм стаў сусветнай сістэмай, рашаючым фактарам міжнароднага жыцця.

Савецкі народ ушчыльную падыйшоў да разгорнутага будаўніцтва камунізма. Праект Праграмы Камуністычнай партыі, якую абмяркоўвае і прыме XXII з'езд партыі, раскрывае перад усім светам грандыёзныя планы гэтага будаўніцтва. «Ад кожнага—па здольнасцях, кожнаму — па патрэбнасцях» — так будзе ў камуністычным грамадстве. Чыё сумленнае сэрца ў свеце не ўсхвалююць поўныя глыбокага сэнсу і зместу словы Праграмы:

«Камунізм выконвае гістарычную місію вызвалення ўсіх людзей ад сацыяльнай няроўнасці, ад усіх форм прыгнечання і эксплуатацыі, ад жахаў вайны і ўсталёўвае на зямлі Мір, Працу, Свабоду, Роўнасць і Шчасце ўсіх народаў».

Упершыню ў гісторыі чалавечага грамадства самая запаветная мара людзей пачынае ператварацца ў канкрэтную яву, камуністычнае Заўтра становіцца камуністычным Сёння.

Вялікія, пачэсныя і адказныя задачы ўстаюць перад будаўнікамі камуністычнага грамадства. Камунізм будуецца не на голым месцы. Прыкметнымі, ужо бачнымі рысамі камунізма прасякнута ўсё наша жыццё. Гэтыя выдатныя рысы і праявы мы бачым у гераічных подзвігах савецкіх людзей, у самаадданай працы наватараў, у жыцці і дзейнасці брыгад камуністычнай працы, у легендарных палётах нашых першых касманаўтаў.

Камуністычная мараль увабрала ў сябе агульначалавечыя нормы маралі, што ўзніклі на працягу тысячагоддзяў гісторыі чалавечага грамадства. Яна ўключыла ў сябе ўсё лепшае з рэвалюцыйных традыцый мінулага, з рэвалюцыйнай маралі рабочага класа, з вялікага вопыту сацыялістычнага будаўніцтва. Яна загартоўвалася ў агні рэвалюцыі. Яна ўбірала ў сябе ўсё лепшае з думак, жаданняў, імкненняў мільёнаў людзей, якія будуюць цяпер новы свет, дзе «чалавек чалавеку — друг, таварыш і брат». У ёй, крыштальна чыстай, чалавечнай, бачым мы і жывое ўвасабленне запаветаў, дум вялікага правадыра, чалавека, які «...к товарищу милел людскою лаской», а да ворага «...вставал железа тверже».

У праекце Праграмы сфармуляваны асноўныя прынцыпы маральнага кодэкса камунізма, такія, як адданасць справе камунізма, любоў да сацыялістычнай Радзімы, да краін сацыялізма, добрасумленная праца на карысць грамадства, высокае ўсведамленне грамадзянскага абавязку, калектывізм, гуманныя адносіны паміж людзьмі, сумленнасць і праўдзівасць, камуністычныя ўзаемаадносіны ў сям'і, непрымірымасць да ўсялякіх заганаў, недахопаў і інш.

Наша Радзіма — дружная, з'яднаная сям'я братніх народаў, якая не ведае нацыянальнай і расавай розні. Будаўнік новага свету падтрымлівае брацкую салідарнасць з працоўнымі ўсіх краін, з усімі народамі.

Будаўнік камунізма — гэта ўсебакова развіты чалавек, у якім гарманічна спалучаюцца духоўнае багацце, маральная чысціня і фізічная дасканаласць. Узброены ведамі навуковага камунізма, паважаючы і любячы працу, як крыніцу радасці і першую жыццёвую патрэбнасць, маральна чысты, непрымірымы да ўсяго злога, варожага, ён будзе будаваць жыццё так, як аб гэтым гаварыў вялікі заснавальнік марксізма — «па законах прыгажосці».

З рэспубліканскай мастацкай выстаўкі самадзейных майстроў выяўленчага і прыкладнога мастацтваў.
Барэльеф Ул. І. Леніна, зроблены В. Собілевым (г. Гомель).

ДРУГАЯ СУСТРЭЧА З ДРАМАТУРГАМ

Тэатр юнага гледача настойліва шукаў і шукае свой рэпертуар, свой мастацкі почырк. Тэатр створаны для моладзі, і яго калектыў хоча вырашаць тэмы; якія хвалююць моладзь, вырашаць іх па-свойму, самабытна. Першым плённым крокам на шляху да вырашэння гэтай задачы з'яўляецца тое, што тэатр скіраваў сваю ўвагу на творчасць маладых беларускіх драматургаў. Ён смела дае трыбуну для іх твораў, памагае маладым драматургам удасканальваць свае творы і адначасова сам вучыцца на іх пошуках, удачах і няўдачах.

Цікавай для тэатра з'явілася сустрэча з настаўнікам з Маладзечаншчыны Іванам Козелам.

Іван Козел першай сваёй п'есай «Папараць-кветка» дэбютаваў у Тэатры юнага гледача. Твор напісаны на яркім сакавітым фальклорным матэрыяле вельмі добра гарманіраваў з патрабаваннямі рэжысуры, з творчымі імкненнямі калектыву выканаўцаў. Імкненне разнастаіць спектаклі песняй, народным карагодам, танцамі з першых дзён работы тэатра стала яго адметнай уласцівасцю.

Спалучэнне народнай абраднасці, звычаяў беларускай вёскі з новымі драматычнымі падзеямі ў сацыяльным жыцці характэрна для «Папараць-кветкі», у якой поўна і ярка раскрыліся здольнасці акцёраў і рэжысуры. Спектакль меў заслужаны поспех у гледача, ён у пэўнай меры стварыў імя маладому драматургу.

Сёлета Іван Козел прапанаваў тэатру сваю новую п'есу «На хвалях Серабранкі». Гэта твор сучасны і надзённы. Такім чынам, творчае супрацоўніцтва тэатра і драматурга працягваецца.

У новым спектаклі заняты амаль усе тыя акцёры, што і ў «Папараць-кветцы», і таму вельмі цікава прасачыць, як выраслі за гэтыя гады і тэатр і яго драматург, што новае знойдзена імі і што страчана.

Новая п'еса Козела — прыкметная з'ява ў сучаснай беларускай драматургіі. Аўтар ставіць у ёй рад праблем перавыхавання чалавека сучаснай вёскі, барацьбы з прыватнаўласніцкай чарвяточынай. Драматург напісаў твор цікавы, з вострымі калізіямі. Як і ў першай п'есе, аўтар шырока скарыстоўвае дасціпнае і вострае народнае слова. Асноўныя вобразы п'есы яркі індывідуалізаваны, са сваімі моўнымі асаблівасцямі, што дае магчымасць кожнаму акцёру стварыць арыгінальны, каларытны вобраз у агульным ансамблі.

У п'есе асноўная сюжэтная лінія глыбока драматычная. Калгасны бухгалтар Фёдар Жыгліцкі супольна са сваёй маці хоча, каб і яго жонка Ядзя стала сквапнай і рабіла ўсё толькі для дому. І хоць драма Ядзі не выстаўляецца на першы план, яна застаецца ў цэнтры ўвагі, знітоўваючыся з развіццём усяго дзеяння. Такое знітаванне стварае арганічны сплаў.

Захаванне ў спектаклі гэтага адзінства дзеяння, насычанага і сапраўдным драматызмам і добрым гумарам, павінна было стаць тым асноўным, што належала вырашыць рэжысёру і акцёрам. Дасягнуць гэтага можна было толькі пры глыбокім прачытанні кожнай ролі, прадуманасці кожнай мізансцэны. Гэта тым больш важна, што ў п'есе няма аднаго галоўнага героя, вобраз якога стаяў бы ў цэнтры спектакля і стымуляваў у той ці іншай ступені развіццё характараў іншых персанажаў, з'яўляўся б камертонам унутранага рытму спектакля.

У спектаклі ж атрымлівецца так: рэжысёр Л. Мазалеўская вылучае асобных, прытым не самых асноўных персанажаў. Такое вылучэнне, якое часам пярэчыць самой задуме п'есы, прыводзіць да таго, што ансамбль, які намячаецца ў пачатку спектакля, у далейшым развіцці дзеяння часам распадаецца.

У п'есе маці Фёдара, Ярына Жыгліцкая з'яўляецца ўскоснай віноўніцай жыццёвай драмы Ядзі. Яна робіць усё для таго, каб ператварыць свайго сына Федзю ў хіўца, хапугу. У ім самім пасяліўся ўжо «гаспадарчык», пасяліўся даўно, можа, нават з дзяцінства. Але вакол зусім іншае жыццё, яго дыханне дакранулася і Федзі. Ён прымае гэтае жыццё, але «гаспадарчык» цягне яго назад. Цягнуць і парады маці. Праца да нажывы захапіла яго. «Гаспадарчык» у ім перарос у ваўкаватага «гаспадара». Становіцца зразумелым цяжкае становішча Ядзі. Іменна не вобразу трэба было ўдзяліць асноўную ўвагу.

Душэўная драма Ядзі (арт. Л. Цімафеева), яе барацьба за мужа, за сваё права быць чалавекам, яе няўдалае каханне — гэта самыя хвалюючыя эпізоды ў п'есе. Лёс Ядзі, яе ўнутраная барацьба, нарастаючы пратэст і, нарэшце, разрыў з гнілым светам уласнікаў, «другое нараджэнне чалавека» — усё гэта засланяецца ў спектаклі іншым. Рэжысёр чамусьці акцэнтуе сваю ўвагу на ролі Ярыны Жыгліцкай (актрыса А. Ротэр). Ярына аказваецца ў цэнтры кожнай дзеі, кожнай мізансцэны. Нават знаходзячыся на другім плане, яна ўсю ўвагу прыкоўвае да сябе. Ротэр іграе тэмпераментна, але часам выходзіць далёка за рамкі самога вобраза. Мы згодны з актрысай, калі яна малюе Жыгліцкую як сімвал прагавітасці і хціваści. Але калі гэтая цёмная фігура пачынае засланяць іншых герояў, якія блядненюць і становяцца другараднымі, тады цяжка пагадзіцца з такою трактоўкай вобраза. Тут бы, акурат, рэжысёру памагчы актрысе разабрацца ў месцы і значэнні яе ролі, у імкненнях Жыгліцкай, у яе псіхалогіі, але атрымалася наадварот. У спектаклі недарэчы ўзмоцнены акцэнт на гэтай ролі. Занадта ўжо магутнай выглядае Ярына ў параўнанні з іншымі персанажамі.

Іменна такога пачуцця меры часам нестае і некаторым іншым выканаўцам. Так, акцёр П. Дубашынскі спачатку чула і ўмела паказвае, як паступова мара пра багацце заваладвае Федзям. На жаль, у трэцяй дзеі, калі наступае развязка, акцёр «выбіваецца з калеіны». Гнеў, лютасць, выбух нянавісці, усведамленне сваёй бездапаможнасці, свайго паражэння прымусілі Федзю рашыцца на страшэнны ўчынак. У гэтай сцэне трэба было знайсці адзіна правільную лінію паводзін, добра прадумаць кожны жэст, кожную рэпліку, інакш увесь драматызм моманту зводзіцца да меладрамы. П. Дубашынскі ў гэты кульмінацыйны момант так і не здолеў пераканаўча паказаць усю глыбіню перажыванняў свайго героя. Яго Федзя становіцца раз'юшаным зверам, яго ўчынак псіхалагічна не апраўданы, бо вырашаецца занадта прасталінейна.

Свету хціўцаў, уласнікаў процістаяць у п'есе Шыдлоўскія. Артысты У. Говар-Бандарэнка (Язэп) і Ю. Фляйто (Антаніна) стварылі каларытныя вобразы слаўных, жыццялюбных калгаснікаў. Яны яшчэ больш падкрэсліваюць, у якую бездань коцяцца Жыгліцкія. Асабліва гэта выразна паказана ў апошняй дзеі. Весялосць і радасць у Шыдлоўскіх. Узрушаныя, трошкі смешнаватыя Язэп і Антаніна, а поруч змрочныя, панурыя суседзі. Гэта, бадай, адна з лепшых сцэн у спектаклі. Вобраз Язэпа Шыдлоўскага — бясспрэчная ўдача артыста У. Говар-Бандарэнкі. Ён стварыў каларытную фігуру простага калгасніка, жартаўніка, вострага на язык, дабрадушна грубаватага, але сумленнага чалавека. Хочацца адно параіць акцёру пазбегнуць некаторай утрыроўкі ў пачатку спектакля.

Вялікае месца ў спектаклі займае вобраз Андрэя. Хлопец гэты шукае лёгкага жыцця і доўгага рубля. Яму нічога не значыла пакінуць на Урале жонку з дзіцем і прыехаць у родныя мясціны ў пошуках цёпленькага месца. Рэжысёр Л. Мазалеўская і артыст А. Бяляеў знайшлі правільную трактоўку гэтага характару. Тут была спакуса пайсці на пратэтанай дарожцы і паказаць зацятага нягодніка, амаральнага тыпа, для якога прага нажывы стала сэнсам усяго жыцця. Але тады нельга было б апраўдаць паводзін ягонай жонкі Розы (артыстка М. Міцкевіч), яе кахання, веры ў тое, што Андрэй яшчэ можа стаць сапраўдным чалавекам. А. Бяляеў знайшоў правільную лінію вобраза. Паказваючы пустату, ханжаства, лёгкадумнасць свайго героя, ён у той жа час падкрэслівае, што Андрэй не прапашчы чылавек, што ў ім яшчэ цепліцца агенчык чалавечнасці. Праўда, часам акцёр малюе Андрэя залішне дуркаватым і нейкім хваравітым, тады гледачу мімаволі становіцца шкада хлопца, які збіўся з тропу.

Яркія, запамінальныя вобразы каваля Ціхоня і яго жонкі Зосі стварылі артысты В. Окалаў і М. Каралёва. Прываблівае непасрэднасць і жывасць у гэтых вобразах.

Сюжэтная лінія Жэні і Васіля развіваецца паралельна з асноўнай тэмай п'есы. Узаемаадносіны гэтых маладых людзей павінны служыць як бы прыкладам шчырага і гордага кахання, якое не ідзе ні на якія ўступкі старым звычкам, аджытай маралі. Сварка іх узнікла таму, што Жэня хоча абараніць права на сваё «я», якое страціла Ядзя ў сям'і Жыгліцкіх. З тае прычыны, што супрацўленне Васіля ідзе не ад яго перакання, а з'яўляецца нейкай хлапчукоўскай бравадай, канфлікт вырашаецца лёгка і шчасліва.

Б. Барысёнак у ролі Васіля знаходзіць яркія дэталі, праўдзіва тлумачыць матывы паводзін свайго героя, імкнецца адыйсці ад тых «блакітных» герояў, якіх нямала сыграў за апошні час. І ўсё ж акцёр не поўнасцю скарыстаў магчымасці вобраза. Нам здаецца, што і драматург не да канца распрацаваў яго. Васілю ў канцы п'есы адведзена вельмі пасіўная роля. Ён быццам з'яўляецца госцем на сваім уласным вяселлі. Не здолеў перамагчы некаторай схематычнасці вобраза і акцёр. Як толькі ён змяніў шафёрскі камбінезон на модны касцюм, дык адразу быццам адчуў сябе ў іншай стыхіі. Сарамлівасць і вуглаватую рашучасць простага хлопца як рукой зняло.

Артыстка Р. Маленчанка іграе Жэню з гарачым запалам падлетка, як і ранейшыя ролі падобнага плана. Яна шчырая, пераканальная, але і толькі. Ніякіх новых рысаў для характарыстыкі сваёй гераіні актрыса не знайшла. Хлапецкая зухаватасць была ўласціва вобразам маладых сучасных гераінь, якія стварала Р. Маленчанка і раней. Хацелася б убачыць у яе выкананні новыя фарбы. У вобразе Жэні была магчымасць знайсці іх. Сварка ж з любым чалавекам была для яе не дробным выпадкам, не загадзя прадуманай інсцэніроўкай, а выпрабаваннем сваіх сіл, пачуццяў Васіля, яго поглядаў. Таленавітая актрыса можа стварыць вобраз больш шматграннны і яркі.

Можна многа гаварыць аб асобных удачах і недахопах спектакля, але не ў гэтым галоўнае. Задумваешся над другім. Вельмі добра, што тэатр мае свайго драматурга, які жыве ў гушчыні народа і бачыць навакольнае жыццё не вачыма праезджага журналіста, а сам бярэ актыўны ўдзел у Ім. Людзі, пра якіх ён піша, гэта яго суседзі, аднавяскоўцы. Ён ведае ўсё, іх жыццё, думкі і надзеі, ведае, што хвалюе, радуе і засмучае іх. Сардружнасць тэатра з драматургам абодвум прыносіць новыя творчыя ўдачы.

На жаль, тэатр з таго часу, як паставіў першую п'есу драматурга, не пайшоў уперад так далёка, як драматург. Калектыў тэатра не стаіць у баку ад жыцця, ён многа падарожнічае па рэспубліцы, па краіне, сустракаецца са сваімі героямі ў калгасах, на заводах, у ВНУ, на канферэнцыях гледачоў. Але ці гэта паніжаная патрабавальнасць да сваёй творчасці, захапленне дробязямі і другарадным, мі дэталямі, фатаграфіяй замест абагульнення, ці гэта няўменне знайсці галоўнае, па-мастацку асэнсаваць жыццёвы матэрыял прывяло да таго, што спектакль «Над хвалямі Серабранкі» ніжэйшы па сваім узроўні, бяднейшы за п'есу І. Козела. Тэатру трэба было больш патрабавальна паставіцца да прачытання і ўвасаблення талакавітай п'есы маладога драматурга, і тады б спектакль яшчэ больш парадаваў гледача.

Т. АРЛОВА,
С. ПАЛЯКОЎ.

СЯБЕ ПАКАЗАЦЬ І ДРУГІХ ПАСЛУХАЦЬ

У музычных перадачах Беларускага радыё значнае месца адводзіцца мастацкай самадзейнасці. У эфіры часта гучаць канцэрты лепшых хораў, аркестраў, ансамбляў і асобных выканаўцаў. Рэгулярна перадаюцца канцэрты—нарысы аб музычных калектывах, аб творчасці народных складальнікаў песень. У дапамогу мастацкай самадзейнасці арганізоўваецца многа перадач, з якіх аматары музыкі могуць даведацца пра тое, як найбольш мэтазгодна размеркаваць рэпетыцыйны час, з чаго пачынаць свае заняткі, як і дзе набыць рэпертуар.

Увесь час пашыраецца фанатэка Беларускага радыё запісамі шматлікіх аматарскіх калектываў. Рэдакцыя музычнага вяшчання не толькі робіць запісы ў час розных агляданў і конкурсаў самадзейнасці, але накіроўвае спецыяльныя брыгады ў калектывы мастацкай самадзейнасці. За мінулы год фанатэка запісаў павялічылася на 400 твораў. Пераважная большасць—гэта творы беларускіх аўтараў, лепшыя ўзоры народнай музыкі.

Беларускае радыё ў мінулую суботу правяло «Дзень мастацкай самадзейнасці», прысвечаны XXII з'езду КПСС.

«Дзень» адкрыў кароткім уступам кіраўнік Беларускага дзяржаўнага народнага ансамбля песні і танца Г. Цітовіч. Ён расказаў аб развіцці народнай самадзейнасці ва ўсіх жанрах мастацтва, не выключаючы оперы, сімфанічнай музыкі і, нават класічнага балета. Затым перад мікрафонам выступілі калгасныя артысты. Радыёслухачы пазнаёміліся з выканаўчым майстэрствам харавой капэлы «Сцяг Саветаў» Навагрудскага раёна, хору калгаса імя Сталіна Ляхавіцкага раёна, хорамі калгасаў «Бальшавік» Слонімскага раёна, «Чырвоны Кастрычнік» Уздзенскага раёна, імя III з'езда Саветаў Кіраўскага раёна і выступленнямі асобных спевакоў. Самыя разнастайныя па складу аркестры і ансамблі выканалі рад народных беларускіх, рускіх і польскіх танцаў.

Вялікае месца ў рэпертуары многіх самадзейных харавых калектываў займаюць песні аб Радзіме. Менавіта гэтай тэме быў прысвечаны радыёканцэрт «Мы любім Радзіму». У праграме «Выступаюць воіны Беларускай ваеннай акругі» прынялі ўдзел лепшыя ваенныя самадзейныя духавыя і народныя аркестры, хоры.

Яшчэ зусім нядаўна лічылася, што мастацкая самадзейнасць неахвотна пашырае свой рэпертуар за кошт класічнай музыкі. Вялікі канцэрт «Мы выконваем класіку» поўнасцю абверг гэтую думку. У яго праграму ўвайшлі: першая частка «Нясканчанай сімфоніі» Ф. Шуберта (выконваў Брэсцкі гарадскі сімфанічны аркестр), вальс з оперы Ш. Гуно «Фаўст» (харавая капэла клуба чыгуначнікаў станцыі Брэст), уступ да оперы Ж. Бізэ «Кармен» (аркестр народных інструментаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Леніна), «Вясельны марш» з музыкі Ф. Мендэльсона да камедыі В. Шэкспіра «Сон у летнюю ноч» (сімфанічны аркестр Віцебскага гарадскога Дома культуры), раманс Антаніды з оперы М. Глінкі «Іван Сусанін» у выкананні ўдзельніцы мастацкай самадзейнасці Гомельскага Палаца культуры імя Леніна Марыі Чэкан і іншыя.

Праграма аднаго з канцэртаў цалкам была аддадзена выступленню старэйшага самадзейнага калектыву нашай рэспублікі — народнага хору сяла Азэршчына Рэчыцкага раёна.

Сям'я народных складальнікаў песень Беларусі няспынна папаўняецца за кошт таленавітай моладзі. Імёны многіх самадзейных кампазітараў шырока вядомы ў нашай рэспубліцы. Яны звязаны сваёй творчасцю і працай з мастацкай самадзейнасцю. У перадачу «Іх песні спявае народ» былі ўключаны творы заслужаных дзеячоў культуры П. Шыдлоўскага, П. Касача, А. Шыдлоўскага, мастацкага кіраўніка Карэліцкага Дома культуры П. Шаўко, правадніка вагонаў станцыі Брэст Д. Васільева, кіраўніка хору Віцебскага Дома культуры В. Смірнова і іншых.

«Дзень мастацкай самадзейнасці» паказаў добрае выканаўчае майстэрства і музычны густ многіх калектываў, разнастайнасць іх рэпертуару і шырыню творчага дыяпазону. У канцэртах можна было пачуць і беларускую песню ў нескладанай апрацоўцы, і вялікі, цяжкі для выканання твор для хору без суправаджэння, і мелодыю народнага танца ў выкананні на цымбалах ці баяне, і складаны твор сімфанічнай музыкі, жартоўную песеньку і вялікую арыю з оперы. Выступалі самыя разнастайныя па майстэрству і жанрах калектывы, ад нядаўна арганізаваных з яшчэ вельмі малым выканаўчым стажам да вядомых самадзейных ансамбляў з багатым вопытам канцэртнай работы. Радуе тое, што многія калектывы не абмяжоўваюцца толькі выкананнем, але здольны вырашаць і творчыя пытанні. Таму ў праграмах канцэртаў часта можна было пачуць словы: «Музыка і тэкст калектыву», «Песня створана артыстамі хору», «Музычная апрацоўка калектыву» і г. д.

Прыемна адзначыць, што многія з апрацовак, як і іх выкананне, вызначаліся рысамі прафесіяналізму. Нам здаецца, што «Дзень мастацкай самадзейнасці» карысны не толькі тым, што пазнаёміў радыёслухачоў з лепшымі прадстаўнікамі самадзейнага мастацтва, але і тым, што даў магчымасць яго ўдзельнікам паслухаць сябе па радыё, параўнаць свае выкананне з выкананнем іншых калектываў.

Д. ЖУРАЎЛЕЎ.

НА СЦЯГ І ГЮЙС

Гэта здарылася выпадкова. Матрос па разгубленасці не задраіў люк шахты падачы паветра дызелям, і як толькі падводная лодка пачала тэрміновае пагружэнне — у кармавы адсек са страшэнным напорам уварвалася вада. Дарэмна намагаліся матросы Каданёў, Пінчук, Факін і Цымбал задраіць люк. Ці ж маглі стрымаць чатыры чалавекі струмень ціскам у некалькі тон? А на падводнай лодцы ёсць жалезнае правіла: здарылася штонебудзь, каманда адсека павінна сама выпраўляць становішча... Праз дзве хвіліны ў адсеку было каля 30 тон вады і лодка, страціўшы ўстойлівасць, амаль у вертыкальным стане паляцела ўніз. На саракаметровай глыбіні карма ўрэзалася ў мяккі ілісты грунт. Пляснулі плафоны і патухла электрычнасць. Трывожна замільгацела аварыйная лямпачка, наступіла цішыня.

Цяпер, калі паветра ў адсеку было нібы спрасаванае, вада не пайшла праз шахту, і матросы з цяжкасцю задраілі люк. Пад вадою, навобмацак, старшына другой стацыі Рыгор Каданёў знайшоў тэлефон і звязаўся з цэнтральным пастом. Камандзір лодкі дазволіў выйсці з адсека...

Так пачаліся напружаныя гадзіны барацьбы за жыццё, за выратаванне падводнай лодкі. Становішча было небяспечнае. Прадзьмуць цыстэрны галоўнага балласта і ўсплывуць матросы не мелі магчымасці. Для гэтага трэба было вырваць карму з ілістага дна і ўраўнаважыць лодку. Камандзір Расціслаў Белазёраў сабраў падводнікаў на цэнтральны пост. Гледзячы ў вочы таварышам, сказаў:

— Каб пакласці лодку на роўны кіль, у нас ёсць толькі адно выйсце — перапампаваць дваццаць тон вады з кармы на нос. Але мы не можам выкарыстаць сціснутае паветра. Яго вельмі мала. Выйсце такое: перанасіць ваду вёдрамі.

Экіпаж згадзіўся, але вёдраў на лодцы не было. У ход пусцілі бачкі, у якіх кок гатаваў страву. І па ланцугу з рук у рукі папоўз цяжкі бачок. Папоўз знізу ўверх— пераборкі адсекаў сталі падлогай, а падлога — сценамі. Працавалі гадзіну, другую. Адпачылі некалькі хвілін і — зноў бачок у рукі.

Пяцьдзесят бачкоў, сто, сто пяцьдзесят...

На далонях набялела скура і ўздулася. Потым мазалі трэскаліся і марская вада раз'ядала далоні. Сочыцца з далоняў кроў... Дзвесце бачкоў, дзвесце пяцьдзесят...

Вось ужо дваццаць гадзін лодка ў палоне мора. Цяжка становіцца дыхаць, не хапае паветра. Тэмпература знізілася да чатырох градусаў. Толькі ў адным адсеку гарыць аварыйная лямпачка. Трэба берагчы электраэнергію. І зноў плывуць бачкі. Трыста дваццаты, трыста дваццаць першы...

Пахіснуўся старшы матрос Мікола Дзеранчук і страціў прытомнасць. Яго падхапілі сяброўскія рукі і перанеслі ў другі адсек. Карабельны фельчар устанавіў дыягназ: атручанне вуглякіслым газам. Лячэнне — чыстае паветра. Камандзір загадаў ачысціць паветра ў лодцы патронамі рэгенерацыі. Стала крыху лягчэй дыхаць. Дзеранчук цяжка ўзняўся і стаў на сваё месца ў ланцугу.

Праз дзве гадзіны стомленыя матросы моўчкі размясціліся ў цэнтральным пасту. Пра гэты момант у вахценным журнале захаваўся такі запіс: «Пачаўся камсамольскі сход. Парадак дня— прыём у члены ВЛКСМ матроса Дзеранчука». Рэкамендацыі далі камітэт камсамола лодкі і капітан трэцяга ранга Белазёраў. Выступленні матросаў былі вельмі кароткія—па паўмінуты: каб у часе прамоў залішне не расходаваць паветра. Сакратар камсамольскага бюро, старшына другой стацыі Павел Мексімюк кіўнуў у бок Дзеранчука і той, цяжка дыхаючы, сказаў:

— Нарадзіўся ў Беларусі... Працаваў токарам... Спагканняў за час службы не маю...

Пайшлі трэція суткі марскога палону, трэція суткі барацьбы са стыхіяй. Было адчувальна, што карабель значна зменшыў дэферэнт. І раптам усе прыслухаліся, пачулі: па корпусу лодкі — серыя ўдараў. На мове вадалазаў гэта азначае выклік на сувязь. Яму адказалі. Потым нібы абцасам грымнулі па металічным борце. У адказ — адзін удар з лодкі.

І вадалаз далажыў па тэлефоне на паверхню, што самаадчуванне экіпажа нармальнае.

Праз суткі лодка ўсплыла...

Мы стаім учацвярых на беразе бухты. Раніца. Густы туман ахутаў элегантныя стройныя эсмінцы, і цяжкія шэрыя танкеры, і прыплюснутыя, як скавароды, баржы. Каля пірса прышвартавалася вядомая ўсяму свету «Слава». Вялізны карабель выступае з туману шэрым шматпавярховым домам. Па традыцыі б'юць рынду і на кацерах, нібы начныя птушкі, ускрыкваюць равуны.

Матрос Альберт Віткоўскі, былы токар Мінскага завода аўтаматычных ліній, углядаецца ў далечыню і гаворыць:

— Служу электрыкам. Забяспечваю электрагаспадарку падводнай лодкі. А вось ён, — Віткоўскі паказаў вачыма на матроса Антона Ціхана, — кацельны машыніст. Адказвае за падачу ацяплення на карабель.

Нізкарослы, крыху сарамлівы, ён не хоча расказваць пра сябе і ўсё пытаецца:

— Як там у Беларусі? Можа, у маёй вёсцы Пяскі былі? Яна ў Лідскім раёне...

Чацвёрты мой новы сябра — старшы матрос Іван Фіешка з вёскі Крывіна Бешанковіцкага раёна. Ён маўклівы. Пра яго шхіперскую службу расказалі Віткоўскі і Ціхан.

А служба ў маракоў-падводнікаў суровая і цяжкая. Бываюць дні, калі вялізныя хвалі кідаюць лодку з борта на борт і на баявую рубку няспынна навальваюцца дзесяткі тон халоднай вады. Яна наскрозь праходзіць праз парусінавую вопратку вахценных, соллю раз'ядае твар, а вецер, насычаны вільгаццю, слепіць вочы. Вось у такі час трэба сачыць за морам. Здаецца, няма хвалі, якая б здолела скрануць з месца вахценнага матроса. І ў сярэдзіне карабля ў маленькай цеснай каюце праз навушнікі слухае мора акустык, чарнабровы балкарац Ільяс Атараў. Ён чуе, як цяжка дыхаюць хвалі, як шамаціць каменнем бераг, як шапоча ў скалах белая пена. Яго пільнае вуха распазнае далёкі глухі рокат карабельных вінтоў. Ён беспамылкова дакладвае:

— Па курсу шум вінтоў эсмінца!

Які навык патрэбен, якое майстэрства, каб праз вялізную тоўшчу вады за тры, за сем кіламетраў толькі па гуку вінтоў распазнаць клас карабля: эсмінец гэта ці крэйсер, транспарт ці тарпедны кацер. Атараў можа гадзінамі ўслухоўвацца ў рознагалосы піск з навушнікаў радыёпеленгатара і вылоўліваць з яго невыразныя сігналы далёкіх радыёмаякоў.

Служаць з Атаравым на лодцы і класны метрыст Станіслаў Бясконаў, які няспынна сочыць за гарызонтам, і вопытны трумны Уладзімір Сташэўскі, улюбёны ў магутныя рухавікі карабля, і майстар імклівых тарпедных удараў Аляксей Кутняк. Ім патрэбны толькі секунды, каб па загаду камандзіра задраіць люкі і, пагрузіўшыся пад перыскоп, выйсці ў «атаку». Як выбух, прагучыць каманда «Апараты, тоўсь!..» і тарпедыст сцісне ў далонях пісталетныя рукаяткі апаратаў. Пра гэтую каманду добра памятаюць тыя, хто калі-нікалі намагаецца ўпотай увайсці ў нашы тэрытарыяльныя воды. Савецкі ўрад нядаўна папярэдзіў такіх аматараў плаваць. І калі Паўэрсу ўдалося выратавацца, дык ужо тут, як кажуць, выбачайце, але прыдзецца ісці на дно...

Узнімаецца вышэй сонца, знікае з бухты туман. Мае сябры спяшаюцца: роўна ў восем гадзін — пад'ём сцяга. На караблях выстраіваюцца каманды. Вось застылі ў страі экіпажы адной лодкі, другой. Далятаюць словы каманды:

— На сцяг і гюйс смірна!

Не, гэта не толькі каманда, па якой некалькі мінут урачыста ўшаноўваюць сцяг. Гэта каманда заклікае да захавання вялікіх традыцый Ваенна-Марскога Флоту, яна вучыць мужнасці і адвазе. Я зноў прыгадаў фатаграфію майго земляка Мікалая Дзеранчука. Сустрэцца з ім на падводнай лодцы мне не ўдалося: ён дэмабілізаваўся і цяпер працуе загадчыкам сельскага клуба ў вёсцы Літоўск Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці. Днямі пазваніў па тэлефоне ў Драгічын. Прыемна было пачуць, што Мікалай Дзеранчук працуе добра, што нядаўна ён прыняты ў члены Камуністычнай партыі. Шчыра кажучы, я быў упэўнены, што так складзецца лёс гэтага чалавека: у жыцці Дзеранчук заўсёды трымаў раўнанне на савецкі сцяг.

Ілья КЛАЗ.

Н-ская падводная лодка.

У чэргу будучых твораў



З рэспубліканскай мастацкай выстаўкі самадзейных майстроў выяўленчага і прыкладнога мастацтва.
П. СІТНІКАЎ. «Магілёўская прыстань».

ВЕЧАРЫ АБ КАМУНІЗМЕ

Яны выходзілі на трыбуну і расказвалі аб тым, якой уяўляюць нашу будучыню. Чым стане праца для чалавека? Якія подзвігі чакаюць яго? Ці застануцца ў новым грамадстве зайздрасць, рэўнасць, дармаедства?—аб усім гэтым горача гаварылі камсамольцы вёскі Залессе Смаргонскага раёна на тэматычным вечары «Разведчыкі будучыні», які нядаўна адбыўся ў Доме культуры.

Цікавасць моладзі да гэтай тэмы заканамерная. У мясцовым калгасе «Чырвоны партызан» ёсць брыгада механізатараў, якой прысвоена ганаровае званне камуністычнай. Цяпер многія камсамольцы вырашылі таксама змагацца за званне ўдарнікаў камуністычнай працы!

Не першы раз у нас праводзяцца тэматычныя вечары. Таму ўсё было загадзя прадумана і прадугледжана. Пасля абмеркавання і зацвярджэння плана вечара на камсамольскім сходзе, адразу ж былі размеркаваны абавязкі—хто і за што адказвае. Так, напрыклад, даклад «Маладыя будаўнікі камунізма» даручылі прачытаць настаўніцы Л. Сальнікавай, за мастацкае афармленне Дома культуры павінны былі адказваць камсамолкі Яніна Паўлюкевіч і Тамара Канькова.

І вось надышоў той вечар, да якога так актыўна рыхтаваліся, якога чакалі юнакі і дзяўчаты вёскі. На яго прыйшло каля ста маладых працаўнікоў калгаса.

— Нашы разведчыкі будучыні— члены брыгад камуністычнай працы,—заявіла Л. Сальнікава, — на справе паказваюць, якой яшчэ больш натхнёнай стане праца пры камунізме для кожнага чалавека.

Усхваляваным было выступленне сакратара партбюро арцелі, Сцяпана Рыгоравіча Токмана.

— Людзі будучыні ўяўляюцца мне дужымі і мужнымі, гатовымі на ўсё ў імя ідэі, за якую яны змагаюцца,—гаварыў ён.

Стары камуніст, настаўнік Сцяпан Логвінавіч Кухарэнка расказаў прысутным, як камсамольцы ў першыя гады Савецкай улады актыўна ўдзельнічалі ў палітычным і культурным жыцці вёскі. Яны ніколі не баяліся цяжкасцей, дапамагалі партыі.

На гэтым цікавым вечары сакратар камітэта камсамола Марыя Далінская паведаміла, чым сустрэлі партыйны з'езд камсамольцы і моладзь калгаса. Яны правялі нядзельнік па азеляненню вёскі, пасадзілі каля ста дэкаратыўных дрэў і кустарнікаў, стварылі пры Доме культуры камсамольска-маладзёжную агітбрыгаду, якая наладзіла 12 канцэртаў для калгаснікаў.

Большасць камсамольцаў удзельнічае ў гуртках мастацкай самадзейнасці. Лепшых з іх—Анатоля Ястрэмскага, Генадзя Дудко і Аляксея Шымана рэкамендавалі ў партыю.

У нас за апошні час паспяхова прайшлі вечары на тэмы: «Мы будзем жыць пры камунізме», «Маральны кодэкс будаўніка камунізма», а цяпер рыхтуем вечар—«Ці гатоў ты жыць пры камунізме?»

Тэматычныя вечары аб камунізме выклікаюць жывую цікавасць у маладых працаўнікоў вёскі.

В. СУРМАЧ,
дырэктар Залескага сельскага Дома культуры, Смаргонскага раёна.

У Мінску адбыліся гастролі ансамбля песні і танца Чарнаморскага флоту.

Фота Ул. КРУКА.

ЛЁС МАЛЫХ ГАРАДОЎ

У апошні час назіраецца значны рост вялікіх гарадоў, узнікаюць новыя прамысловыя пэятры (Салігорск, Нова-Полацк, Светлагорск, Белаазёрск). У бліжэйшыя дваццаць год у Беларусі будзе пабудавана не менш 250 буйных прадпрыемстваў.

У гэтых умовах вялікай увагі патрабуе планамернае размяшчэнне новых прамысловых прадпрыемстваў. У праекце Праграмы КПСС гаворыцца: «Разгорнутае будаўніцтва камунізма патрабуе ўсё больш рацыянальнага размяшчэння прамысловасці, якое забяспечыць эканомію грамадскай працы, комплекснае развіццё раёнаў і спецыялізацыю іх гаспадарак ліквідуе празмерную скучанасць насельніцтва ў буйных гарадах, будзе садзейнічаць пераадоленню істотных адрозненняў паміж горадам і вёскай, далейшаму выроўніванню ўзроўняў эканамічнага развіцця раёнаў краіны».

Цяпер Белдзяржпраект завяршае складанне схемы размяшчэння буйных прадпрыемстваў на дваццацігадовы перыяд. З ростам прамысловасці прыкладна ў два з палавінаю разы павялічыцца колькасць насельніцтва.

Буйная прамысловасць сканцэнтравана ў нас у асноўным у 18-ці гарадах. Прадугледжваецца дадатковае размяшчэнне яе яшчэ ў 30-ці малых гарадах, дзе выгодныя транспартныя сувязі, добрыя водныя рэсурсы. Электрагаспадарку можна падключыць да рэспубліканскай энергасістэмы, а ў многіх месцах можна выкарыстаць газаправод. Усё гэта спрыяльныя ўмовы для развіцця малых гарадоў.

Аднак, калі сельскія населеныя месцы ў рэспубліцы паступова павялічваюцца з дапамогаю калгасаў і саўгасаў, дык развіццё малых гарадоў застаецца праблемай. Трэба ўлічыць, што каля 80 працэнтаў беларускіх гарадоў налічвае да 10 тысяч чалавек кожны і з'яўляюцца пераважна раённымі цэнтрамі.

Такія гарады, як Рэчыца, Добруш, Рагачоў, Жлобін, Вілейка, Івацэвічы, Кобрын, Гарадок і многія іншыя маюць сваю гісторыю, пэўныя традыцыі, а таксама спрыяльныя ўмовы для размяшчэння ў іх прамысловасці. Стварэнне ж у далейшым зусім новых прамысловых гарадоў і пасёлкаў, за рэдкім выключэннем, у Беларусі наўрад ці мэтазгодна.

Нямала нашкодзіла развіццю нашых малых гарадоў і іх добраўпарадкаванню тое, што звычайна параўнальна невялікія прадпрыемствы (ільнозаводы, РТС, цукровыя заводы і інш.) і карлікавыя жылыя пасёлкі пры іх будаваліся далёка ад раённых цэнтраў. Колькі такіх карлікавых пасёлкаў у нас з'явілася за апошнія гады! Паедзьце ў Крупкі і вы ўбачыце адзін з іх. Кіламетраў за шэсць ад раённага цэнтра, налева ад магістралі Мінск — Масква, Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР па праекту былога Белсельпраекта пабудавала ільнозавод і пры ім пасёлак з некалькіх дзесяткаў домікаў. У такім пасёлку ні сярэдняй школы, ні універмага, ні кінатэатра не пабудуеш, і таму тут жыць нязручна і нявесела.

У рэспубліцы размяшчэнне прамысловых прадпрыемстваў цяпер абавязкова ўзгадняецца з Дзяржбудам БССР. Гэта ўзмацніла кантроль за правільным будаўніцтвам, а таксама развіццём населеных месц. Прывядзём адзін з прыкладаў. Меркавалася пабудаваць цукровыя заводы за тры-чатыры кіламетры ад Слуцка і Калінкавіч і непасрэдна ля іх стварыць жылыя пасёлкі. Пасля таго, як умяшаўся Дзяржбуд, новыя дамы для рабочых замест гэтых карлікавых пасёлкаў будуць пабудаваны ў малых гарадах.

Трэба сур'ёзна паставіць пытанне аб маральнай адказнасці архітэктараў-планіроўшчыкаў за якасць горадабудаўнічых работ. Нам здаецца, што Саюз архітэктараў павінен прымаць меры грамадскага ўздзеяння на праекціроўшчыкаў, якія ігнаруюць элементарныя патрабаванні горадабудаўніцтва.

Калі буйныя прамысловыя прадпрыемствы будуць размешчаны ў вялікай групе малых гарадоў, яны будуць развівацца больш паспяхова. Што датычыць астатніх малых гарадоў, пераважна раённых цэнтраў (па тры-сем тысяч насельніцтва ў кожным), дык іх развіццё звязана з далейшым ростам мясцовай прамысловасці, канцэнтрацыяй міжкалгасных прадпрыемстваў, а таксама ростам устаноў сістэмы раённага абслугоўвання.

У Беларусі намячаецца развіццё двух тыпаў малых гарадоў: прамысловых, з насельніцтвам у сярэднім 40—50 тысяч чалавек кожны, і цэнтраў сельскагаспадарчай вытворчасці, мясцовай прамысловасці і сістэм раённага абслугоўвання, з насельніцтвам 10—20 тысяч чалавек.

Велічыня другой групы малых гарадоў у радзе выпадкаў ужо вызначалася ў сувязі з распрацоўкай праектаў раённай планіроўкі сельскагаспадарчых раёнаў.

Што датычыць лёсу развіцця вялікіх гарадоў, да якіх адносяцца абласныя цэнтры Беларусі, дык у іх колькасць насельніцтва павялічыцца да 250—300 тысяч чалавек. Гродна, напрыклад, за 20-гадовы перыяд вырасце ў тры разы.

Асабліва сур'ёзнай з'яўляецца праблема далейшага развіцця сталіцы рэспублікі — горада Мінска. У зацверджаным у 1959 г. генеральным плане перспектыўнага развіцця Мінска прадугледжвалася, што насельніцтва горада да 1965 г. будзе складаць 650 тысяч чалавек і да 1980 г. — 800 тысяч чалавек. Пры гэтым нашы горадабудаўнікі не ўлічвалі размяшчэння ў горадзе новых прамысловых прадпрыемстваў, неабходнасць у якіх з'явілася на практыцы. Напрыклад, у Мінску, дзе працуюць аўтамабільны і трактарны, неабходны і маторны завод. І гэта не выпадкова, бо на трактарным заводзе ўжо ёсць у зародку такое прадпрыемства ў выглядзе буйнага маторабудаўнічага цэха, на базе якога на працягу пасляваенных год выраслі высокакваліфікаваныя кадры, перамяшчэнне якіх было б вельмі цяжкім. Апроч таго, новы завод па сутнасці будзе працаваць на кааператыўных асновах з трактарным.

Каб не памыляцца ў прагнозах развіцця прамысловасці буйных гарадоў, трэба больш грунтоўна вывучыць эканоміку сучаснай прамысловасці.

Як паказваюць папярэднія разлікі, у Мінску, дзе цяпер жуе жыве каля 600 тысяч чалавек, у канцы 1980 г. будзе не менш аднаго мільёна чалавек.

У сувязі з гэтым прынята рашэнне аб карэкціроўцы генеральнага плана горада. Асаблівы клопат выклікае неабходнасць стрымання далейшага росту горада.

Праект прыгараднай зоны Мінска, які распрацоўваецца Белдзяржпраектам, прадугледжвае стварэнне некалькіх гарадоў-спадарожнікаў на базе цяперашніх малых гарадоў і пасёлкаў (Дзяржынск, Смалявічы, Рудзенск), а таксама значнае развіццё раду населеных пунктаў гарадскога тыпу, ператварэнне іх у навуковыя цэнтры, цэнтры адпачынку, цэнтры медыцынскага абслугоўвання і інш.

Каб правільна рэгуляваць рост горада, рад прадпрыемстваў будзе вынесены з горада ў прыгарад і за яго межы. Справа ў тым, што многія прадпрыемствы цяпер апынуліся сярод шчыльнай жылой забудовы і не маюць рэзервнай тэрыторыі для пашырэння. Гэта перашкаджае іх мадэрнізацыі.

Рэальны шлях вырашэння гэтай праблемы, на нашу думку, заключаецца ў стварэнні філіялаў прадпрыемстваў за межамі жылой тэрыторыі ў сумежных з горадам раёнах. А ў будучым паступова будуць перабазіраваны і асноўныя прадпрыемствы.

Само жыццё пацвярджае, што гэта найбольш рэальны шлях. Напрыклад, завод імя Варашылава ў Мінску мяжуе з ракой, што праходзіць праз цэнтральную частку горада, і акружаны жылымі дамамі. Пасля неаднаразовых спроб Саўнаргаса вырашыць праблему тэрытарыяльнага пашырэння завода, кіраўніцтва яго само прыйшло да высновы, што філіял завода неабходна стварыць у іншым месцы.

Цікавы вопыт развіцця станкабудаўнічага завода імя Кірава ў Віцебску. Гэтае прадпрыемства, знаходзячыся ў цэнтральнай частцы горада, насуперак горадабудаўнічай мэтазгоднасці, працягвала пашырацца на абмежаванай тэрыторыі. Але ўрэшце ўсе тэрытарыяльныя рэзервы былі вычарпаны. У сувязі са значным перспектыўным ростам валавой прадукцыі Саўнаргас паставіў пытанне аб стварэнні філіяла завода за горадам.

Лёс нашых гарадоў непарыўна звязаны з прынцыпамі далейшага размяшчэння прамысловасці.

Гэта карэнныя праблемы нашага горадабудаўніцтва, у паспяховым вырашэнні якіх кроўна зацікаўлены наш народ.

Е. ЗАСЛАЎСКІ,
архітэктар.

Звыш 30 канцэртаў дала ў гэтым годзе ў раёнах вобласці агітбрыгада Гродзенскага абласнога Дома народнай творчасці. Нядаўна самадзейныя артысты з поспехам выступілі ў новым клубе калгаса «Сямігодка» Іўеўскага раёна.
НА ЗДЫМКУ: выступае салістка агітбрыгады Алена Чайноўская.

Фота М. КАРЖУЕВА.

Пачуццё высокай адказнасці

— З выключным хваляваннем пачалі мы шостага кастрычніка асенне-зімовы сезон, — сказаў у гутарцы з нашым карэспандэнтам дырэктар Брэсцкага тэатра імя ЛКСМБ Л. Валчэцкі.— Хацелася і нам, работнікам беларускага мастацтва, сустрэць гістарычны XXII з'езд КПСС новымі спектаклямі на тэмы, якія асабліва цікавяць савецкага гледача.

Прэм'ера «У сэрцы Афрыкі» (па матывах рамана Б. Дэвідсана «Рачныя парогі», пастаноўка Г. Волкава, мастак А. Гзыла, кампазітар М. Русін) — антыкаланіяльцкі твор, у якім выкрываюцца белыя плантатары і іх звярыная расісцкая мараль. У нашым новым рэпертуары ёсць таксама камедыя «Фараоны» А. Каламійца на тэму калгаснага жыцця (пастаноўка Ю. Арыянскага, мастак А. Петрачэнка).

Рэжысура тэатра адначасова вядзе рэпетыцыі па трох новых п'есах.

Драма Фрыца Кына (ГДР) «Крэдыт у Нібелунгаў» выкрывае былых нацыстаў і цяперашніх заходнегерманскіх рэваншыстаў, якія намагаюцца распаліць полымя трэцяй сусветнай вайны. Над спектаклем працуюць рэжысёр П. Вінаградаў і мастак А. Гзыла.

Камедыю М. Крэйндэль і М. Смірновай на тэмы жыцця нашай моладзі «У сябе ў палоне» ставіць рэжысёр Г. Волкаў (мастак Ул. Мудрогін).

Галоўны рэжысёр Ю. Арыянскі рыхтуе спектакль па п'есе маладога беларускага драматурга Я. Пасава «Чалавек за бартом» — на тэму барацьбы з сектанцтвам.

З тых твораў савецкіх драматургаў, якія ўжо напісаны або пастаўлены іншымі тэатрамі, наш калектыў зацікавіўся новай п'есай І. Дварэцкага «Вялікае хваляванне», драмай В. Пановай «Провады белых начэй». Мы знаёмімся таксама з п'есай Д. Угрумава «Чамадан з наклейкамі», інсцэніроўкай па раману «Чэсць» Р. Мядынскага.

Узнаўляюцца і найбольш значныя старыя спектаклі: «Брэсцкая крэпасць», «Няроўны бой», «Іркуцкая гісторыя», «Анна Карэніна». У апошнім спектаклі ў ролі Анны ўпершыню выступіць таленавітая артыстка Наталля Камінская.

Мы будзем таксама паглыбляць творчыя сувязі з народнымі тэатрамі.

Акцёры і рэжысёры Ю. Арыянскі, А. Асторыка, Г. Волкаў, Н. Ганчарэнка, С. Яўдошанка і іншыя па прыкладу мінулага года будуць выступаць з гутаркамі і лекцыямі па праблемах тэатра ў гарадскім універсітэце культуры.

Брэсцкі тэатр мае добрую традыцыю трывалых сувязей з вясковымі гледачамі. За невялікі час пасля пачатку сезона нашы артысты са спектаклямі «Кухарка», «І праўда і шчасце», «Фараоны» наведалі калгасы Высокаўскага, Камянецкага, Кобрынскага, Ружанскага і Брэсцкага раёнаў.

Цяпер рыхтуемся да паездкі на будаўніцтва Бярозаўскай ДРЭС.

— У гэтыя дні ў нашай роднай Маскве, — сказаў у заключэнне Л. Валчэцкі, — праходзіць з'езд ленінскай партыі, на якім будуць прыняты новая Праграма і новы Статут партыі. Гэтыя гістарычныя дакументы адкрываюць велізарныя перспектывы для росквіту культуры будаўнікоў камунізма, для новага творчага ўздыму савецкага тэатра. Наш калектыў прыкладзе ўсе намаганні для таго, каб павысіць ідэйна-мастацкае ўчуванне сваіх спектакляў.

ПА КАНЦЭРТНЫХ ЗАЛАХ

ТАЛЕНАВІТЫ ГІТАРЫСТ

Гітара належыць да ліку інструментаў, якія карыстаюцца вялікай любоўю шырокіх мас. На жаль, з гітарай, як з канцэртным інструментам, на эстрадзе сустрэцца можна не часта. І не дзіўная тая вялікая цікавасць, якую выклікаў канцэрт у Мінску вядомага іспанскага гітарыста Ніколаса Альфонса.

Першае, што звяртае на сябе ўвагу ў канцэрце артыста, гэта вялікі і разнастайны рэпертуар, які ўключае музыку для гітары, пачынаючы з XVI стагоддзя (Гальярды, Роулэнда) да нашых дзён (творы Віла-Лобаса, Тароба і г. д.). Ніколас Альфонса выконвае не толькі творы, напісаныя спецыяльна для гітары, але і пералажэнні музыкі Іагана Себасцьяна Баха, створанай для клавесіна, фартэпіянныя п'есы Гранадаса, Альбеніса і іншых «негітарных» кампазітараў. Пры наяўнасці выдатнай выканаўчай тэхнікі ігры на гітары, артыст ніколі не падмяняе перадачу глыбіні зместу твораў вонкавым віртуозным бляскам. Асабліва варта адзначыць прыгажосць і высакароднасць гуку ў ігры выканаўцы.

Ніколас Альфонса некалькі год жыве і працуе ў Бельгіі. Канцэртную дзейнасць ён пачаў з 1945 года і вельмі паспяхова выступаў апроч Бельгіі ў Іспаніі, Англіі, Францыі, Галандыі і ў некаторых афрыканскіх дзяржавах. Яго канцэрты ў Савецкім Саюзе з вялікім поспехам праходзілі ў Маскве, Ленінградзе, Таліне, Рызе, Вільнюсе. У Мінску Н. Альфонса закончыў свае гастролі ў СССР.

В. БАРХАТАВА.

На экране фільмы кінааматараў

У нашай рэспубліцы ёсць ужо каля ста аматарскіх кінастудый. Напярэдадні адкрыцця XXII з'езда КПСС у Мінску быў наладжаны агляд аматарскіх фільмаў.

12 шыракаплёначных карцін і 11 на вузкай плёнцы было прадстаўлена на агляд. Іх рабілі супрацоўнікі Мінскага медыцынскага, студэнты Беларускага політэхнічнага інстытуту, рабочыя Мінскага трактарнага завода і іншыя.

Сярод фільмаў звяртаюць на сябе ўвагу — «Капрон замест металу», «За тэхнічны прагрэс», «Дом тэхнікі Беларускай чыгункі», створаныя аматарскай студыяй Дома тэхнікі Беларускай чыгункі; кінанарысы «Медыцынскі экран» (медінстытут); «Рапарт Радзіме», «Мы заўсёды напагатове»—аматарскай кінастудыяй вайсковай часці; фільм дзіцячай кінастудыі Палаца прафсаюзаў «Зорачка» і інш. Два фільмы—«Сустрэча» і «Асенні эцюд» ішлі пад рубрыкай «Мастацкія».

Карціны былі розныя па сваёй якасці і прафесіянальнай пісьменнасці, тым не менш усе яны ў той ці іншай меры адлюстроўваюць наша жыццё.

Так у фільме «Разведчыкі будучыні» (рэжысёр-аператар Кульгавы) ёсць добры намер расказаць пра жыццё простых савецкіх людзей, якія робяць вялікія справы. Знаёмыя і блізкія нам людзі паказаны ў працы, у творчым напружанні вынаходцаў, у час вучобы і адпачынку.

Добрае ўражанне пакідаюць фільмы «Рапарт Радзіме», «Мы заўсёды напагатове» старшага лейтэнанта Дронава. Аўтар не толькі ведае, але і любіць сваіх герояў, уважліва сочыць за іх баявой вучобай.

У большасці фільмаў гаворка ідзе пра чалавека, пра яго справы. Аўтары іх стараюцца захапіць як мага шырэйшы пласт жыцця. Але аматары не ўмеюць яшчэ праз аднаго чалавека паказаць калектыў, у іх яшчэ няма ўвагі да тых дробязей, рысачак, якія падкрэсліваюць характар чалавека.

Так, у фільме «Жыць згодна статуту» няма нават імкнення раскрыць вобраз чалавека. Героямі твора з'яўляюцца пункты вайсковага статуту, а не людзі, для выхавання якіх створаны гэты статут.

Многія аматарскія фільмы трацяць яшчэ і таму, што ў іх няўдалыя тэксты. Не адчуваецца, што слова — самастойны кампанент фільма. Тэкст часта проста паўтарае кадры. У дакументальным фільме слова яднае ў адно цэлае матэрыял, выяўляе ідэю твора. Дыктарскі тэкст павінен быць эмацыянальным, вобразным, немнагаслоўным, толькі тады ён арганічна спалучаецца з кадрам. Часам у фільме няма сінхроннасці паміж тэкстам і кадрам: дыктар гаворыць адно, а на экране бачыш другое.

Некаторыя аматары паспрабавалі свае сілы і ў мастацкай творчасці. Ваеннаслужачы В. Шарыкаў зняў фільм «Сустрэча», які атрымаў другі дыплом. Сюжэт фільма дэтэктыўны. Нейкая дзяўчына па заданню замежнай разведкі праходзіць у воінскую часць. Усё астатняе паказана спрошчана і прымітыўна.

Некалькі слоў аб арганізацыі конкурсу. Усе фільмы былі паказаны ў другой палове дня. Прагледзець усе іх, тым больш уважліва, было нялёгка. А галоўная мэта агляду—не толькі выявіць лепшыя работы, але і забяспечыць далейшы творчы рост удзельнікаў. Магчыма, патрэбна было арганізаваць семінар, зрабіць падрабязны разгляд пададзеных на конкурс фільмаў, каб іх аўтары даведаліся пра свае недахопы. А то можа здарыцца, што аматары павязуць дадому разам са сваімі фільмамі і свае памылкі, і ў наступны год тыя ж недахопы з'явяцца на экранах у новай рэдакцыі.

Так ці інакш, але кінааматарства на Беларусі жыве, робіць свае першыя крокі. Хочацца пажадаць, каб аматары менш выконвалі заказы, а кіраваліся загадам свайго сэрца, менш рабілі б інсцэніровак, а больш здымалі жыццё, якое само па сабе паўнапраўнае і маляўнічае. Магчыма, трэба пачынаць не з карцін, а з эцюдаў, закончаных па кампазіцыі, як пачынае мастак вялікае палатно.

Выразнасць задумы, прафесіянальная пісьменнасць, грамадзянскія пачуцці патрыёта—вось тая глеба, на якой павінна расквітнець аматарскае кінамастацтва. Міністэрства культуры, прафсаюзы, Аргкамітэт кінаработнікаў БССР павінны больш удумліва падтрымліваць першыя парасткі новай справы, трымаць пастаянную сувязь з аматарскімі студыямі.

Беларускія кінастудыі могуць узяць шэфства над аматарскімі студыямі, арганізаваць кансультацыі па пытаннях рэжысуры, сцэнарыя, аператарскай работы і г. д. І тады энтузіясты кіно Беларусі здолеюць стварыць жывы летапіс сваёй рэспублікі.

Г. РАТНІКАЎ.

Галоўны рэдактар Нічыпар ПАШКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Аляксандр БУТАКОЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Аркадзь МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), Пятро ПРЫХОДЗЬКА, Раман САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), Мікола ТКАЧОЎ, Янка ШАРАХОЎСКІ, Іван ШАЦІЛА, Рыгор ШЫРМА.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі—3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара—3-25-25, аддзела літаратуры—3-22-04, аддзела мастацтва—3-24-62, аддзела культуры—3-20-54, выдавецтва—3-19-52, бухгалтэрыі—3-11-03.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у аўторак і пятніцу

АТ 00421

Друкарня імя Сталіна